ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ГОД ВЫДАННЯ 31-ы | № 16 (1757) | Пятніца, 22 лютага 1963 года. | Цана 4 кап.

Салдаты арміі міру

ЗАЎТРА савецкі народ, уся наша краіна адзначае 45-гадовы юбілей Савецкіх Узброеных Сіл. Народжаная ў агні грамадзянскай вайны і выпеставаная Камуністычнай партыяй пад кіраўніцтвам вялікага Леніна, Савецкая Армія і Ваенна-Марскі Флот у жорсткіх баях адстаялі заваёвы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Вось ужо сорак пяць гадоў яны надзейна ахоўваюць стваральную працу савецкага народа.

Сорак пяць гадоў... У іх — першыя перамогі ў лютаўскія завірухі пад Псковам і Нарвай, разгром Юдзеніча, Калчака і Дзянікіна, штурм Перакопа і Валачаеўскія дні. У іх — Халхін-Гол і лінія Манергейма, Брэсцкая крэпасць і эпапея Ленінграда, разгром гітлераўцаў пад Масквой і бітва пад горадам на Волзе, вызваленне захопленых ворагам раёнаў краіны і штурм Берліна. Усё гэта — этапы вялікага шляху, вызваленчай місіі Савецкай Арміі.

У выніку гістарычнай перамогі Савецкага Саюза над фашысцкай Германіяй працоўныя Польшчы і Румыніі, Балгарыі і Венгрыі, Чэхаславакіі і Югаславіі вызваліліся ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання, стварылі свае народныя дзяржавы і сталі на шлях сацыялістычнага развіцця. Яны — назаўжды з намі і назаўжды застануцца ўдзячны вялікаму Савецкаму Саюзу, яго народам, яго магутнай і слаўнай Савецкай Арміі.

З часу апошніх залпаў мінулай вайны прайшло амаль васемнаццаць гадоў. Але свет не пазбаўлены канчаткова ад жахлівых зданяў новай сусветнай бойні — яшчэ больш жорсткай, яшчэ больш разбуральнай. Амерыканскія імперыялісты аблыталі свет цэлай сеткай сваіх ядзерных баз і ракетных пляцовак, плятуць інтрыгі і змовы супраць краін міралюбівага сацыялістычнага лагера. Зноў і ўсё нахабней трызняць аб рэваншы, аб паходзе на ўсход недабітыя гітлераўскія сцярвятнікі. Нарошчваннем узбраенняў заклапочаны французскія і англійскія імперыялісты. Чалавецтва зноў жыве, працуе, спіць у трывозе.

Але на варце яго сну і спакою стаіць Савецкі Саюз, яго Узброеныя Сілы.

Вось чаму чалавецтва з любоўю называе Савецкую Армію — арміяй міру.

Савецкая Армія — дзецішча савецкага народа. Яна акружана штодзённымі клопатамі Камуністычнай партыі, яе Цэнтральнага Камітэта і Савецкага ўрада. Наш народ любіць сваю родную армію і не шкадуе сіл для ўмацавання яе магутнасці — гарантыі міру ва ўсім свеце.

Армія міру... А які ж ён, салдат гэтай арміі?

Пазнаёміцца з ім мы вырашылі ў Мінскім акруговым Доме афіцэраў. Мінчане добра ведаюць гэты строгі і прыгожы будынак на Чырвонаармейскай вуліцы. Аматары музыкі, эстрады, тэатра часта бачаць тут, на выдатнай сучаснай сцэне, выступленні нашых і прыезджых калектываў. Тыя, хто любіць спорт, не раз былі тут сведкамі паядынкаў гімнастаў, барцоў, баксёраў у час рэспубліканскіх, саюзных і міжнародных спаборніцтваў. Ну, а мінскія дзяўчаты — лепш за ўсё, бадай, яго танцавальныя залы — блакітную і ружовую...

Прыблізна такое ўяўленне аб Доме афіцэраў мелі і мы, калі ўпершыню прыйшлі сюды не з білетамі на канцэрт ленінградскага ансамбля «Дружба» ці польскага «Шлёнска», а з прыладамі фотакарэспандэнта і блакнотам журналіста: прыйшлі зрабіць адсюль фотарэпартаж.

У фае кінаканцэртнай залы было людна. Аказваецца, сёння ў Доме афіцэраў — сустрэча маладых салдат і моладзі горада Мінска з ветэранамі Савецкай Арміі, удзельнікамі грамадзянскай і Айчыннай вайны. У госці да моладзі прыйшлі тав. Р. Быстрыкаў — пасланец Чырвонасцяжнага Балтыйскага Флоту, удзельнік гераічнай абароны горада Леніна; былы камандзір Магілёўскага абласнога партызанскага злучэння С. Салдаценка-Сідарэнка, абаронца Брэсцкай крэпасці, беларускі пісьменнік Алесь Махнач і Герой Савецкага Саюза, палкоўнік запасу Л. Пузанаў.

Мы сустрэлі Льва Іларыёнавіча Пузанава ў фае, ля стэнда, прысвечанага Героям Савецкага Саюза. Шчыльна акружылі яго маладыя воіны. З увагай слухаюць яны баявога камандзіра. А яму ёсць што расказаць. Свой шлях салдата ён пачаў у час вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь. Потым — вайна з беларфінамі, а пасля — шматлікія фронты Вялікай Айчыннай вайны: ад сцен Волгаграда да Прыбалтыкі і Беларусі, ад Мінска і Каўнаса — да Варшавы і Берліна прайшоў з баямі Леў Іларыёнавіч Пузанаў...

(Гл. стар. 2, 3, 4).

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

ЗАЎТРА—ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ

РЭПАРТАЖ З ДОМА АФІЦЭРАЎ. ВЕРШЫ АРМЕЙСКІХ ПАЭТАЎ. АЎТАР РАМАНА — СТАРШЫНА. ДРУЖБА МАСТАКОЎ З ВОІНАМІ. ВАЕННЫЯ АРКЕСТРЫ, ІХ БУДНІ І ПАТРЭБЫ.

◆

КАНДЫДАТЫ НАРОДА

◆

ПРАЦЯГ РАЗМОВЫ АБ НАДЗЁННЫХ ПРАБЛЕМАХ ЛІТАРАТУРЫ

◆

СЛОВА ПРА ЮЛІУСА ФУЧЫКА

ІДЭІ ЧАСУ, ФОРМЫ ЧАСУ

Уладзімір ЮРЭВІЧ

Сёння ад пісьменніка, калі ён «той, каму даражэйшае і вышэйшае за ўсё званне чалавека, чалавек «па прафесіі» (А. Блок), час вымагае вельмі шмат чаго. Але першае—ён павінен жыць вялікімі ідэямі эпохі, бачыць, як той радыётэлескоп, далёка наперад, адчуваць перспектывы рэвалюцыйнага развіцця грамадства, якое будуе найсправядлівейшы лад—камунізм.

У нашы дні адбываецца нечуванае яшчэ ў гісторыі ўзбагачэнне асобы дасягненнямі навукі і тэхнікі, бурнае абнаўленне пачуццяў чалавека, якое, можа, і не выкіравалася пакуль у пэўнае рэчышча. І зусім заканамерна, што партыя, якая заўсёды стаяла на варце чысціні камуністычнай ідэалогіі, звяртае ўвагу дзеячоў літаратуры і мастацтва на тое, каб яны былі непрымірымыя да ўсялякіх спроб адвесці мастака ў бок ад справы служэння народу.

Наш компас — сацыялістычны рэалізм, сутнасць якога ў тым, каб дасягнуць у творы спалучэння жыццёвага і ідэйнага зместу. Рэалістычнае ўзнаўленне жыцця не можа быць адлучана ад рэчаіснасці і яе марксісцкага разумення. У гэтым наватарскі характар метаду сацыялістычнага рэалізму, які не забараняе, а вітае смелыя пошукі не толькі новых тэм, ідэй, вобразаў, але і новых форм іх мастацкага адлюстравання.

І калі мы за сацыялістычны рэалізм, які грунтуецца на выкарыстанні лепшых традыцый мінулага і рэвалюцыйных пошукаў прыгожага, узвышанага, мы не можам не клапаціцца пра галоўнае—каб кожны твор мастацтва стаў здабыткам народа, увайшоў у залаты фонд яго духоўнай скарбніцы. А такім можа быць толькі твор, натхнёны пазнаннем новага, «таму што ўсякі твор тады толькі твор мастацтва, калі ён адкрывае новы бок жыцця» (Л. Талстой).

Каб пошук, адкрыццё былі плённыя, партыя і клапоціцца пра ідэйную чысціню творчасці мастакоў, напамінаючы пра тое, што «...вышэйшы крытэрый, асародак сацыялістычнага рэалізму—мастацкая і жыццёвая праўда, якой бы суровай яна ні была» (Л. Ільічоў).

Сёння наша літаратура, як і жыццё савецкага народа, у імклівых пошуках, якія ідуць пад сцягам творчага абнаўлення свету, стварэння найлепшых умоў для росквіту кожнай асобы, шчырай пашаны да чалавека. Працэс інтэнсіўнага «ачалавечвання», гуманізацыі мастацтва, які пачаўся пасля XX з'езда партыі, даў ужо багаты плён і ў беларускай літаратуры.

Мы шмат у апошні час гаворым пра сучаснасць у літаратуры, забываючыся, што слова гэта было спадарожнікам творчага жыцця не аднаго пакалення мастакоў, што яно было заўсёды побач з сапраўдным мастацтвам. XX з'езд партыі памог нам вылечыць гэта слова ад немачы, да якой давяла яго нарматыўная крытыка ў гады культу Сталіна, калі пад сцягам сучаснасці выступалі пазалота, мішура, прыхарошванне, фанфаронства.

Дарэчы, і ў гады росквіту культу былі мастакі, чый агонь творчасці прабіваўся праз каменную агароджу сталінскага валюнтарызму. Не ўсе забываліся, што сэнс жыцця мастака ў творчасці, як не ўсе страчвалі кантроль над сабой, ахвяруючы святой праўдай жыцця. Іменна ў трыццатыя гады дасягнуў вяршыні сваёй творчасці класік беларускага рамана Кузьма Чорны, які здолеў паглыбіцца ў псіхалогію селяніна-працаўніка і стварыць вобраз вялікага сацыяльна-філасофскага гучання. У канцы трыццатых гадоў мы сталі сведкамі ўзлёту сатырычнага таленту («Хто смяецца апошнім») выдатнага савецкага камедыёграфа Кандрата Крапівы, які так бязлітасна выкрываў у чалавеку двудушніцтва, страх, кар'ерызм — усё тое, што называем мы сёння перажыткамі культаўскіх часоў. Адступніцтвам ад праўды гісторыі было б не заўважаць усяго гэтага і станавіцца на шлях голага адмаўлення сапраўдных поспехаў літаратуры нядаўняга мінулага.

Партыя дала нам правільную арыентацыю для ўмацавання тых сувязей літаратуры з народам, якія

РОЗДУМ МЕРКАВАННІ ПАЛЕМІКА

былі расхісталіся ў змрочныя гады культу, паказваць жыццё такім, якое яно ёсць, **для таго, каб паляпшаць яго.** І вось у гэтым—каб паляпшаць жыццё—заключаецца сэнс творчасці мастака сацыялістычнага рэалізму, яго імкнення да пошукаў новага зместу, новых форм.

Калі гаварыць пра сённяшні дзень беларускай літаратуры, нельга не заўважыць заўзятага імкнення пісьменнікаў адкрываць усё новыя грані нашага творчага метаду. І гэта становіцца клопатам усіх пакаленняў пісьменнікаў. Прыкметна зменшылася колькасць твораў павярхоўна-прапагандысцкіх, ілюстрацыйна-апісальных. Усё часцей мы сустракаемся з творамі, адзначанымі сапраўдным наватарствам — прагнай зацікаўленасцю ўсім новым, што дзеецца ў жыцці, імкненнем да сучаснага асэнсавання з'яў мінулага.

У беларускай паэзіі пабагацеў свет думак літаратурнага героя, узнялася эмацыянальная культура верша А. Куляшова, чый творчы шлях—заўсёдныя пошукі размоўных інтанацый, яркіх асацыяцый. У вершах мінулага года і асабліва ў цыкле «З новай кнігі» («Полымя» № 10, 1962) паэт заззяў яшчэ адной гранню свайго лірычнага таленту — філасофскім роздумам над лёсам чалавека і чалавецтва, над вечнасцю жыцця на нашай планеце. Магутны выклік часу гучыць у вершы гімнам несмяротнасці чалавецтва.

Ты згасіш сонца, час, але не згіне
Наш род людскі — каманда карабля —
Ён мачтавыя сосны не пакіне.
Пакуль ім будзе палубай зямля.

Паэту трэба было ўзняцца на ўзровень сучаснага навуковага мыслення, прасякнуцца клопатамі сярэдзіны XX стагоддзя, калі дамоклавым мечам вісіць над светам пагроза тэрмаядзернай катастрофы, каб сутыкнуць у непрымірымай спрэчцы чалавека і час, тленнае і вечнае — такія, здавалася б, несуразмерныя велічыні. Сінтэз напружанай думкі і высокага пачуцця, дазволілі А. Куляшову пайсці далей размовы з самім сабою і ўстрывожыцца па-сапраўднаму трагедыяй, што чакае планету.

...Мне ў рукі лёс не шпагу даў, не лук,
А ўсю Зямлю, з арэнай—Млечным шляхам.
Качу яе, падобную на мяч,
Ахопленую вадародным жахам.
Як хворую, загортваю ў кумач,
Качу, каб не скрануў яе з арбіты
Заакіянскі вдавіты грыб.

Адна страфа, а ў ёй—змест жыцця цэлай эпохі. Такога лаканізму адлюстравання, такой ёмістасці думкі паэт дасягнуў праз трапна ўжытыя асацыяцыі. «Качу яе, падобную на мяч» — і мы адчуваем перамогу чалавека над часам. «Як хворую, загортваю ў кумач» — і новае пачуццё ахоплівае нас, пачуццё пашаны да той вылечнай сілы, якой з'яўляецца для свету чырвоны сцяг камунізма. Нечаканасць вобразнай асацыяцыі ў А. Куляшова амаль заўсёды падмацавана вялікай сэнсавай нагрузкай. І мусіць таму такі вялікі пачуццёвы зарад маюць вершы. Уменне думаць вершам — гэта не рацыяналістычнасць, як спрабуюць сцвярджаць некаторыя.

Мудрасцю веку, адзнакай новага часу азораны вершы не толькі старэйшага пакалення паэтаў. «Двум пакаленням за працай не цесна: мы з аднаго ваяўнічага цеста», — сцвярджае П. Панчанка ў вершы «Размова з наследнікамі», маючы на ўвазе тых, хто жадаў бы пасварыць «бацькоў і дзяцей» у літаратуры. Імкненне да філасофскага асэнсавання тых сацыяльных зрухаў, што адбываюцца ў свеце, да заглыблення ў самую запаветную таямніцу паэтычнага вобраза характэрна для М. Танка і П. Панчанкі, П. Макаля і Р. Барадуліна, С. Дзяргая і Ул. Караткевіча, А. Наўроцкага і Р. Тармолы... Не будзем доўжыць пералік, а звернемся лепш да прыкладаў.

Хто з паэтаў не задаваў сабе пытання пра суадносіны вялікага і малога ў жыцці? Паступлена яно і А. Русецкім у вершы «Вечны гадзіннік і колеры жыцця» («Маладосць» № 12, 1962 г.). Паэт аналітычнага мыслення вядзе свайго лірычнага героя ў «майстэрню сонца, хларафілу» каб паказаць, як

...свеціцца, ходзіць сок паміж праменняў...
І тканку тчэ, зялёны ходзіць сок
(аснова — промні, а паветра — ўток)
І тчэ зямля зялёнае адзенне.

(Заканчэнне на 2-й і 3-й стар.).

«ДРУЖБА», «ВЕДЫ», «МЕЛОДЫЯ»...

— Дзе вы купілі кнігу?
— У магазіне № 4.

Не, не гавораць так пакупнікі. Называюць вуліцу альбо рог, успамінаюць адметныя асаблівасці будынка.

А чаму, уласна, нашы кнігарні павінны быць безыменнымі? Увайшлі ж ужо ў Маскве і іншых гарадах ва ўжытак такія назвы, як «Бярозка», «Спадарожнік», «Святлана», назвы, дарэчы, дадзеныя магазінам ювелірным, прамтаварным, прадуктовым. Няўжо гандаль кнігамі больш празаічны занятак?

Мы звязаліся з Галоўкнігагандлем Міністэрства культуры БССР. Намеснік начальніка Упраўлення А. Раковіч паведаміў нашаму карэспандэнту:

— Перайменаванне кніжных магазінаў ужо ідзе. Першымі пачалі гродзенцы. Новую кнігарню, якая адкрылася ў іх, назвалі «Раніцай». У бліжэйшы час новыя назвы атрымаюць і сталічныя магазіны. Магазіну «Кнігі краін народнай дэмакратыі» надаецца назва «Дружба», магазін № 11, які спецыялізуецца на продажы вучэбна-метадычнай літаратуры, будзе называцца «Веды». Новая назва з'явіцца і ў нотнага магазіна. Выбар яшчэ не зроблен, але, магчыма, гэта будзе «Музычны Мінск» альбо «Мелодыя». У рэспубліцы 79 кнігарань. Мы просім кнігааматараў, актывістаў кніжнага гандлю, нашых пісьменнікаў унесці свае прапановы, памагчы работнікам гандлю ў выбары найбольш удалых назваў.

З ВЯЛІКАЙ ПРАГРАМАЙ

Студэнтаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі часта запрашаюць да сябе воіны. Канцэрты карыстаюцца поспехам у салдат і сяржантаў БВА. Нядаўна брыгада студэнтаў кансерваторыі зноў выехала з вялікай і цікавай канцэртнай праграмай у воінскія часці.

У канцэрце прымуць удзел студэнты першых і чацвёртых курсаў К. Нагорскі, А. Ляончык, П. Масякін, В. Папова, В. Светларусаў і іншыя. Яны выканаюць творы савецкіх і прагрэсіўных замежных кампазітараў, народныя і папулярныя сучасныя песні. Сем студэнцкіх канцэртных брыгад кансерваторыі абслугоўваюць у гэтыя дні воінаў Савецкай Арміі. Яны дадуць звыш сарака канцэртаў.

М. ТАРАШКЕВІЧ.

У МАСТАКОЎ І СКУЛЬПТАРАЎ

СКАРБНІЦА ПАПАЎНЯЕЦЦА

Нядаўна Мастацкі фонд СССР набыў новыя творы беларускіх майстроў пэндзаля і скульптуры. Сярод іх палотны не толькі вядомых, але і маладых мастакоў Беларусі. Гэта работы «Раніца новага Мінска» М. Данцыга, І. Раманоўскага — партрэты Я. Купалы і Я. Коласа, серыя лінагравюр М. Моўчана, «Калгасніца» А. Паслядовіч, «Цеберда» Ул. Пасюкевіча, «Салігорск будуецца» і «Шахта» І. Стасевіча, творы З. Азгура, І. Ахрэмчыка, С. Селіханава, А. Малішэўскага, І. Глебава і іншых мастакоў. Усяго ва Усесаюзны фонд паступіла звыш шасцідзесяці новых твораў беларускага мастацтва.

У САЛДАЦКІХ КЛУБАХ

«Ваенная тэматыка ў творах беларускіх мастакоў» і «Мастакі аб будаўніках камунізма» — так называюцца дзве выстаўкі, якія накіраваны днямі ў часці Беларускай ваеннай акругі. Усяго на выстаўках 90 карцін. Гэта работы мастакоў І. Давідовіча, К. Касмачова, А. Тычыны, Я. Зайцава, І Стасевіча, Л. Лейтмана і інш.

У адну з воінскіх часцей накіравана выстаўка сатырычных малюнкаў В. Ціхановіча.

ПАДАРУНАК ЗЕМЛЯКАМ

Многія пісьменнікі і мастакі — ураджэнцы Краснапольскага раёна прысвяцілі свае новыя творы людзям роднага краю.

Добры падарунак падрыхтаваў сваім землякам вядомы скульптар, заслужаны дзеяч мастацтва БССР Аляксандр Васільевіч Грубэ, пачатак творчай дзейнасці якога і многія гады жыцця звязаны з Краснапольшчынай. Скульптар выляпіў і выразаў бясплатна перадаць землякам бюсты ўраджэнцаў гарадскога пасёлка Краснаполле—Герояў Савецкага Саюза Міхаіла Майсеевіча Антонава і Ісака Фёдаравіча Ваксмана. Старшы лейтэнант, танкіст Міхаіл Антонаў загінуў смерцю героя пры вызваленні Арла ў жніўні 1943 года. У снежні таго ж года ў бітве за Днепр паў смерцю храбрых і бясстрашны камандзір батарэі камсамолец Ісак Ваксман. Іх кароткае, але яркае жыццё — прыклад беззапаветнага служэння Радзіме.

Хутка бюсты герояў будуць перададзены землякам скульптара.

ЛЕКЦЫІ ЧЫТАЮЦЬ МАСТАКІ

Рабочыя, студэнты і школьнікі Мінска часта запрашаюць у госці мастакоў. Сустрэчы, на якіх ідзе гаворка аб сучасным мастацтве, праходзяць цікава. Нядаўна, напрыклад, С. Герус для вучняў 12 школы прачытаў лекцыю «Мастацтва і сучаснасць». М. Тарасікаў расказаў навучэнцам індустрыяльнага тэхнікума пра абстрактнае мастацтва. Сустрэча кіраўнікоў партыі і ўрада з работнікамі мастацтва і літаратуры ў снежні 1962 г. у Маскве стала тэмай лекцый і гутарак П. Нікіфарава, З. Азгура і іншых мастакоў і мастацтвазнаўцаў. За апошні час імі прачытана звыш трыццаці лекцый аб сучасным мастацтве.

ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА

Партрэты, эцюды, замалёўкі, зробленыя ў роднай Беларусі, у Балгарыі, у Англіі... Гэта работы мастака С. Геруса. Выстаўка яго твораў днямі адкрылася ў Мінскім мастацкім салоне.



Мастак С. Каткоў працуе над эскізам сваёй будучай карціны, якую ён рыхтуе да Усесаюзнай выстаўкі, прысвечанай барацьбе працоўных за мір ва ўсім свеце.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

Пісьменнік і ЧАС

ТВОРЦА І БУДАЎНІК

Кандыдаты НАРОДА

Да вайны Уладзімір Адамавіч Кароль скончыў у Ленінградзе Акадэмію мастацтваў і, атрымаўшы дыплом архітэктара-мастака, марыў працаваць у беларускай сталіцы: тут, у Беларусі, ён нарадзіўся, вучыўся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме, працаваў настаўнікам малявання. Ажыццяўленню мары перашкодзіла вайна, — у асаджаным Ленінградзе ён абараняў разам са сваімі аднакурснікамі гераічны горад ад фашыстаў. І вось, прыехаўшы у Мінск, блукаў па яго вуліцах. Страшэнная карціна была перад вачыма: горад ляжаў у руінах. Пешаходныя сцяжынкі ішлі праз завалы друзу.

Але горад будаваўся. Мінчане выходзілі на нядзельнікі, аднаўлялі разбураныя будынкі. А ў архітэктурных майстэрнях ужо распрацоўваліся праекты новых вуліц, плошчаў, ансамбляў, якія павінны былі вырасці на папялішчах. Мінула некалькі гадоў. Будаўніцтва горада набывала ўсё больш незвычайныя маштабы. На руінах ствараўся па сутнасці новы сучасны горад з новай планіроўкай і забудовай. І архітэктар Ул. Кароль — цяпер старшыня Дзяржбуда БССР, а ў той час — кіраўнік архітэктурна-планіровачнай майстэрні пры Белдзяржпраекце, сёння можа разам са сваімі калегамі сказаць: «А ва ўсім гэтым ёсць частка і нашай працы». Але ён не гаворыць так, а проста расказвае, як, прыехаўшы ў Мінск, засумаваўшы па любімай справе, з галавою рынуўся ў работу. А мы ведаем, што як кіраўнік архітэктурна-планіровачнай майстэрні буйнейшай праектнай арганізацыі рэспублікі ён прымаў самы актыўны ўдзел у распрацоўцы новых планіровачных рашэнняў забудовы сталіцы, яе цэнтральных раёнаў і плошчаў. І ва ўсіх гэтых работах адчувалася рука прафесіянала, відаць было ўменне аўтара вырашаць складаныя горадабудаўнічыя задачы.

Заслуга зодчага заключалася і ў тым, што ён не толькі складаў праекты планіроўкі і забудовы, але сам удзельнічаў у ажыццяўленні гэтай забудовы.

З ліпеня 1954 года — у дзесятую гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у цэнтры Мінска ва ўрачыстай абстаноўцы быў адкрыты помнік-абеліск «Перамога». Цяпер ён, шырока вядомы па шматлікіх фатаграфіях, стаў як бы сілуэтнай адзнакай горада. Адным з аўтараў праекта быў архітэктар-мастак Ул. Кароль, які выступіў у сааўтарстве з архітэктарам Г. Заборскім і скульптарамі З. Азгурам, А. Бембелем, А. Глебавым і С. Селіханавым.

Кожнаму мінчаніну — ды і не толькі мінчаніну — знаёмы і будынак Галоўпаштамта на Ленінскім праспекце ў Мінску. Галоўны фасад яго афармлен трохчацвяртнымі калонамі буйнага карынфскага ордэра з моцна падкрэсленым цэнтрам у выглядзе вялікай аркі. У круглай аперацыйнай зале шмат святла і паветра. Будынак гэты ў тыя гады быў бясспрэчным дасягненнем беларускага зодчества. Архітэктура яго, вырашаная ў модных тады класічных манументальных формах, добра падкрэслівае будынак, робіць яго запамінальным. Аўтарам гэтага праекта быў таксама Уладзімір Кароль. Па яго ж праекце ў сааўтарстве з архітэктарам А. Духанам пабудаваны і будынак Цэнтральнага тэлеграфа на Цэнтральнай плошчы ў Мінску, жылы дом работнікаў тонкасуконнага камбіната па вуліцы Мяснікова, а таксама рад дамоў у Полацку, Гомелі і іншых гарадах рэспублікі.

Веданне справы, вялікая працаздольнасць і актыўнасць, арганізатарскі талент хутка вылучылі Уладзіміра Караля ў лік выдатнейшых архітэктурных дзеячоў Беларусі. Ён прымае самы непасрэдны ўдзел не толькі ў работах па аднаўленню беларускіх гарадоў, але і кіруе гэтымі работамі. Ужо ў 1945 годзе Уладзімір Адамавіч прызначаецца намеснікам начальніка Упраўлення па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў БССР, потым начальнікам гэтага ўпраўлення і пазней — старшынёю Дзяржбуда БССР. Знаходзячыся на гэтым адказным посту, Ул. Кароль актыўна ажыццяўляе дзяржаўную будаўнічую палітыку ў рэспубліцы, глыбока цікавіцца ўсімі пытаннямі перадавой айчыннай і зарубежнай тэхнікі і навукі, актыўна ўдзельнічае ў развіцці індустрыяльнага будаўніцтва. Яго часта можна бачыць і ў архітэктурных майстэрнях праектных арганізацый, і дзе-небудзь на будаўніцтве новага горада беларускіх нафтавікоў на беразе Дзвіны, на будаўнічых пляцоўках азотнатукавага камбіната ў старажытным Гродна, на будаўніцтве новых жылых кварталаў у горадзе беларускіх шахцёраў — Салігорску, у новым мікрараёне сталіцы... Да яго парад, заўваг, указанняў прыслухоўваюцца не толькі таму, што ён займае высокую пасаду.

Творчую і дзяржаўную работу Уладзімір Адамавіч спалучае з вялікай партыйна-грамадскай і навукова-педагагічнай дзейнасцю. Член-карэспандэнт Акадэміі будаўніцтва і архітэктуры СССР, дацэнт кафедры архітэктуры Беларускага політэхнічнага інстытута, ён шмат увагі аддае падрыхтоўцы навуковых кадраў у рэспубліцы. Пад яго кіраўніцтвам цэлая плеяда аспірантаў паспяхова абараніла дысертацыі і працуе ў розных архітэктурных органах рэспублікі. Як член праўлення Саюза архітэктараў СССР і БССР ён шмат робіць для далейшага росту творчай актыўнасці архітэктараў. Пры ўсёй яго занятасці Уладзімір Адамавіч знаходзіць час і на творчыя спрэчкі, прычым не толькі з таварышамі па прафесіі, але і ў заводскіх клубах, на шумных сходах студэнтаў, у калгасах, у аўдыторыях вучоных.

Ул. А. КАРОЛЬ.

Пра разнастайнасць навуковых інтарэсаў Уладзіміра Адамавіча Караля сведчаць яго шматлікія артыкулы ў перыядычным друку, асобныя манаграфіі, рэцэнзіі і даклады, экспертызы і кансультацыі па пытаннях архітэктуры. Яго шматгранную дзейнасць неаднаразова ўзнагароджваў урад ардэнамі, медалямі, ганаровымі граматамі.

Усё жыццё і творчасць камуніста Ул. Караля з'яўляецца прыкладам служэння народу. І народ адказвае яму за гэта давер'ем і павагай: старшыня Дзяржбуда БССР, архітэктар Ул. А. Кароль зноў вылучаны кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

І. ЭЛЕНТУХ,
мастацтвазнаўца.

САЛДАТЫ АРМІІ МІРУ

ДРУГІ свой здымак мы зрабілі на рэпетыцыі драматычнага калектыву. ГуртКоўцы рэпеціравалі п'есу Івана Рачады «Людзі ў шынялях». Ролю дзяўчыны Алачкі рыхтуе машыністка Упраўлення тэкстыльнай прамысловасці Валя Марозава. Над роллю Клеапатры Андрэеўны працуе Наталля Данілаўна Лімарэнка, жонка афіцэра. Студэнт політэхнічнага інстытута Юрый Грабеннікаў іграе маёра Волака, а палкоўніка Рудых—Васіль Мікалаевіч Пацэхін, намеснік начальніка Дома афіцэраў.

Вызваліўшыся, Васіль Мікалаевіч падышоў да нас:

— Вось, бачыце, і я не адстаў ад маладых. Стаў «акцёрам». Як пісаў паэт, сюды «меня влечет неведомая сила»,—ён усміхнуўся і дадаў: — Дарэчы, пра наш калектыў. Існуе ён больш пятнаццаці гадоў. За гэты час падрыхтавана не менш чым столькі ж спектакляў. З апошніх можна нагадаць «Барабаншчыцу», «Меч і зоркі», «Нябеснае стварэнне», «Дзмітры Стаянаў». Зараз працуем над «Людзьмі ў шынялях». Займаюцца ў калектыве салдаты, афіцэры, ну і, як бачыце, людзі не ў шынялях, — Васіль Мікалаевіч паказвае на Н. Лімарэнку, В. Марозаву, Ю. Грабеннікава. — Кіруе драматычным гуртком Любоў Іванаўна Мазалеўская — вядомы беларускі рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтва.

На нашу просьбу дапамагчы Васіль Мікалаевіч адказаў так:

— Што вы можаце ў нас убачыць ці знайсці? У Доме афіцэраў ёсць бібліятэка, чытальная зала, кабінет палітасветы і ваенны кабінет, кінаканцэртная, тэатральная і танцавальныя залы, шматлікія пакоі для заняткаў гурткоў мастацкай самадзейнасці. Працуе ў нас студыя выяўленчага мастацтва, аматарская кінастудыя, ёсць шахматны клуб, більярдная. Створаны некалькі груп па падрыхтоўцы салдат і афіцэраў для паступлення ў ВНУ, працуе універсітэт марксізма-ленінізма.

Зараз, напярэдадні нашага юбілею, у нас асабліва шматлюдна. Цяпер, дарэчы, праходзіць трохмесячнік культурнага шэфства дзеячоў навукі, культуры і мастацтва Беларусі над воінамі Беларускай ваеннай акругі. Так што — глядзіце, шукайце, выбірайце,—закончыў Васіль Мікалаевіч.—Гідам вашым, на жаль, быць не магу: рэпетыцыя...

„ЗАБІЦЕ ВАЙНУ!"

«РЭКВІЕМ» Дзмітрыя КАБАЛЕЎСКАГА

«Рэквіем» — так назваў кампазітар Дзмітрый Кабалеўскі свой новы твор.

«Мара напісаць вялікі вакальна-сімфанічны твор памяці тых, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, не давала мне спакою шмат гадоў, — пісаў Дзмітрый Кабалеўскі ў пачатку 1961 года. — Недзе ў глыбіні свядомасці ўжо ўзнікалі няясныя абрысы, музычныя вобразы новага, сучаснага рэквіема...»

Задума кампазітара захапіла паэта Роберта Раждзественскага— і ён стварыў паэму высокага патрыятычнага гучання, вялікіх дум і пачуццяў. Паэма была апублікавана, мела вялікі поспех у чытачоў.

«Напісанае Раждзественскім, — сказаў Кабалеўскі, — аказалася вышэйшым, багацейшым і смялейшым за мае ўяўленні аб тым, якім павінен быць рэквіем...»

У працэсе работы кампазітар унёс толькі нязначныя змены ў пабудову дзесяці раздзелаў паэмы і папрасіў паэта зрабіць невялікія дадаткі да тэксту.

«Рэквіем» Дзмітрыя Кабалеўскага складаецца з трох частак. Кожная частка — гэта самастойны, разгорнуты музычны твор, і разам з тым усе яны тэматычна звязаны адна з адной, аб'яднаны адзінай думкаю. Пачынаецца «Рэквіем» лаканічным уступам, які гучыць засяроджана і ў аснову якога пакладзены першыя фразы заключнага раздзела паэмы:

Помните!
О тех,
кто уже не придет
никогда,
помните!

Пасля ідуць эпізоды першай часткі: «Вечная слава», «Радзіма», «Я не памру» і «Поступ дывізій». Другая частка таксама складаецца з чатырох сюжэтаў: «Чорны камень», «Сэрца маці», «Будучыня» і «Нашы дзеці».

Апошні эпізод трэцяй часткі—«Помніце» — па думцы перапклікаецца з пачаткам твора, з эпізодам «Вечная слава», але яго музычнай і сэнсавай кульмінацыяй з'яўляецца пратэст супраць новай вайны:

Убейте
войну!
Прокляните
войну,
люди Земли!

Сімфанічны аркестр Маскоўскай дзяржаўнай філармоніі, Маскоўскі абласны хор і дзіцячы хор Інстытута мастацкага выхавання пры Акадэміі педагагічных навук РСФСР пад кіраўніцтвам прафесара Уладзіміра Сакалова, салісты Вялікага тэатра СССР Валянціна Ляўко і Уладзімір Валайціс —вось выканаўцы гэтага манументальнага твора Д. Кабалеўскага. Дырыжыруе — прафесар Барыс Хайкін.

— «Рэквіем» — гэта музычны помнік героям, — сказаў Б. Хайкін карэспандэнту АДН. — Аднак сэнсавае значэнне твора Кабалеўскага значна шырэйшае і глыбейшае за яго назву. У ім — глыбокае, філасофскае асэнсаванне жыцця народа, жыцця краіны за вялікі і цяжкі адрэзак часу, роздум пра абавязак народа перад будучымі пакаленнямі чалавецтва.

«Рэквіем» напісаны ўласцівым Д. Кабалеўскаму музычным почыркам — стрыманым, засмучаным, без усялякіх вонкавых эфектаў. Інтанацыйна ён звязаны з папярэднімі творамі кампазітара, з операй «Сям'я Тараса», з Чацвёртай сімфоніяй. Нягледзячы на агульны суровы каларыт музычнай мовы твора, — бо гэта ж рэквіем, — ён гучыць вельмі аптымістычна, ён успрымаецца як патэтычны заклік да людзей — не дапусціць новай вайны.

АДН.

Кандыдаты **НАРОДА**

МАЮ ШЧАСЦЕ ВЕДАЦЬ ЯГО

Уладзімір КАЛЕСНІК

Калі ў нашу партызанскую стаянку на ўскрайку Налібоцкай пушчы прыйшлі ўсе тры браты Брылі, неяк пасвятлела ў зямлянках пад кашлатымі елкамі.

Вайсковая здатнасць мужчыны ў вачах партызан цанілася вышэй за ўсё. Брылі апраўдвалі гэтую ацэнку не толькі тым, што прайшлі службу ў войску, а Міша з Янкам былі нават добра абстраляны на польска-нямецкім фронце, але і баявымі справамі. Яны прыйшлі ў атрад, што называецца, «з музыкай»: дапамаглі нам разбіць свежаспечаны гарнізон у іх вёсцы Загор'і.

Партызаны здагадваліся пра гэта, камандны састаў (мне давялося быць тады начальнікам штаба аднаго з атрадаў) ведаў напэўна. Для нас не было сакрэтам, што ўдзел сям'і Брылёў у партызанскім руху пачынаўся не тою сакавіцкаю ноччу 1944 года.

Іх баявое хрышчэнне адбылося ўлетку 1942 года, калі адзін з першых партызан у ваколіцы, камандзір групы, адчайны хлапец з Данской станіцы Ціхан Дуднік зайшоў у іхнюю хату акрываўлены з падвязанаю рукою. Гаспадары далі параненаму прытулак, схованку, а потым трымалі сувязь з атрадам. Што датычыць партызанскага стажу Янкі Брыля, дык яго можна лічыць з верасня 1939 года, калі ён у лагерах для ваеннапалонных асабіста ўбачыў нялюдскае аблічча нямецкага фашызму і пачаў збіраць абвінаваўчы матэрыял, назіраць і запісваць свае ўражанні, за якія, калі б нататкі трапілі ў рукі гестапа, ён быў бы пакараны так, як каралі тады камуністаў і партызан.

У брыгадзе Янка Брыль хутка праслыў добрым разведчыкам, надзейным баявым таварышам, з якім не страшна апынуцца ў самым пякельным пераплёце. Праўда, смеласці партызанам не трэба было пазычаць. Тое новае, што прынеслі ў лес Міша і Янка Брылі, мела больш духоўны характар.

У нашай мясцовасці (партызанская брыгада «Камсамолец» складалася пераважна з мясцовых жыхароў) сям'ю Брылёў лічылі ўзорам сумленнасці. З юнацкіх год браты займаліся самаадукацыяй, шукалі адказу на маральныя і сацыяльныя праблемы веку ў творах Талстога і Леніна, вялі спрэчкі з рэлігійнымі цемрашаламі, арганізоўвалі самадзейнасць. Міша захапляўся жывапісам, Янка — літаратурай (нават друкаваўся ў беларускіх віленскіх часопісах). І хоць мастацкія здольнасці братоў не былі таямніцай, выхад у свет друкаванага сатырычнага часопіса «Партызанскае жыгала» з вершамі і малюнкамі быў прыемнаю нечаканасцю для партызан і насельніцтва. Помню, раней камісар брыгады ўгаварваў выпускаць баявыя лісткі, дык усе агіналіся: ну, што тут пісаць, калі ўсе бачаць, што кожны сёння з'еў, усе ведаюць, што кожны падумаў, нават каму якія сны сніліся... Аказалася, што пісаць ёсць пра што. Толькі на наша жыццё трэба было глянуць мастаку. Да сённяшняга дня мы, былыя партызаны, адкрываем многа новага ў сваім мінулым жыцці па творах Янкі Брыля.

Пасля вызвалення нашай мясцовасці Івана Антонавіча Брыля назначылі сакратаром газеты «Сцяг свабоды» (орган Мірскага РК КПБ). Так пачаўся яго шлях прафесіянальнага літаратара.

Наша партызанскае сяброўства акрэпла пасля вайны на мінскім, як гавораць, бруку. Ён быў тады маладым, таленавітым пісьменнікам, я — студэнтам літфака. Наведваўся да яго на правах земляка і партызанскага сябра. Янка нядаўна жаніўся і здымаў кватэру ў драўляным доме за паркам Чалюскінцаў. Пакойчык быў цесны і такі цёмны, што за першым прыходам я больш па голасе, чым па выгляду, пазнаў Ніну Міхайлаўну, маладую гаспадыню, якую ведаў яшчэ з партызанскіх лагераў, дзе яна вучыла дзяцей у так званай зялёнай школе.

Шырыня інтарэсаў, тактоўнасць гаспадыні, таварыскасць і невычэрпны гумар — прыкмета дабраты і сілы— гаспадара тады ўжо стваралі нейкую асабліва цёплую каларытную атмасферу гэтай цудоўнай сям'і. У іх заўжды было людна і ўрачыста-весела. Прыходзілі пісьменнікі, знаёмыя, сябры, чыталі ўголас творы, разважалі, спрачаліся.

Кватэра зараз у Брылёў вялікая, добра абстаўлена. Але рэчы, хай самыя каштоўныя, не маюць тут улады над людзьмі. Ніхто не папракне ні позіркам, ні словам земляка-вяскоўца, калі ён, забыўшыся, выцерці ногі, пройдзецца па дыване, пакідаючы сляды ботаў. І не дзіва, што часта ўжо з шостай гадзіны раніцы чуцен стук у дзверы; з'язджаюцца землякі, далёкія і блізкія знаёмыя ў сталіцу па справах. Гаспадар дому вітае ўсіх жартамі і прыказкамі, не падаючы выгляду, што заснуў толькі а другой гадзіне. Асаблівыя прывілеі для таго, хто прыехаў у Мінск палячыцца. Якая б тэрміновая праца ні ляжала на рабочым стале, якія б задумы ні азаралі фантазію мастака,—усё ідзе набок. Іван Антонавіч нібыта зусім забывае, што ён пісьменнік, становіцца апекуном сваіх землякоў.

Часта даводзілася мне падарожнічаць з Янкам Брылём. Першы раз у 1951 годзе, калі на канікулах я вырашыў збіраць рэвалюцыйныя песні былой Заходняй Беларусі, а ён — пазнаёміцца з удзельнікамі рэвалюцыйнага падполля. На веласіпедах мы аб'ездзілі сотні мястэчак і сёл, пазнаёміліся з многімі цікавымі людзьмі. Начавалі на сенавалах, пад стагамі, проста ля вогнішча, аднаўляючы партызанскую дружбу з прыродай. Час быў нялёгкі. Вакол былых членаў КПЗБ стваралася атмасфера палітычнага недаверу. Трэба было выслухоўваць многа крыўд. Па вёсках толькі закончылася масавая калектывізацыя. У людзей не прайшоў неспакой і трывога перад новым. Але, услухоўваючыся ў заліўныя галасы жней на полі, мы адчувалі, што гэтаму новаму жыць і красаваць, што песня пра залатую пшаніцу прайшла праз сэрцы людзей, стала яваю.

Апошні раз мы вандравалі па Палессі мінулым летам. У прамежку паміж першым і апошнім падарожжамі мой сябра аб'ездзіў больш чым паўсвету — Еўропа, Амерыка, савецкая частка Азіі—і з радасцю прыкмеціў я, што яго любоў да сваіх людзей, да жыцця народа, да характара роднай беларускай прыроды стала яшчэ больш чулай і пяшчотнай.

Інтрыгуе мяне, як загадка, спосаб пісьменніка, стыль яго падыходу да з'яў і фактаў жыцця. Здаецца, адзіны яго клопат — не перашкаджаць усім быць натуральнымі. Янка Брыль не выпытвае чалавека, нібы загадзя ведае, што той пачне выдумляць, а выдумляць — задача пісьменніка. Такі прыкметны ў сваім пісьменніцкім таварыстве, востры на слова, праніклівы жартаўнік і штукар, ён робіцца непрыкметным, неяк натуральна зліваецца з асяроддзем простых людзей. Успрымальнасць у яго вострая, памяць учэпістая. Ён не прапусціць ніводнага слоўка, інтанацыі, псіхалагічнага зместу, калі ў гэтым праяўляецца характар. Праз дзесятак гадоў, нібы ў элеватары, захоўваюцца ў яго свядомасці сотні тысяч зярнятак-фактаў, жэстаў, рухаў, выразаў, слоўцаў, такіх свяжуткіх, нібы яны трапілі ў памяць сёння раніцою. І зноў жа пісьменнік часта прапускае самыя эфектныя эпізоды, расказаныя людзьмі. З боку гледзячы, дык такі матэрыял хоць жмуцом гані ў твор дзеля займальнасці. Ён жа інтуіцыяй улоўлівае стрыжань з'явы, каларыт адносін між людзьмі, і выражае сутнасць па-свойму, у адпаведнасці са складам свайго характару і таленту.

Зліваецца душой з простымі людзьмі, якія выступаюць станоўчымі героямі яго твораў, Янку Брылю, відаць, дапамагае тое, што ён не забыўся звычак свайго працоўнага вясковага дзяцінства і юнацтва. Вырасшы пры матцы, цяжка хворай удаве, ён навучыўся выконваць і паважаць нават «жаночую» работу. Мяне, як малодшага ўзростам, колькі раз расчульвала тая натуральнасць, з якою ён першы хапаўся за кацялок з-пад юшкі, рваў траву на хвашчану і браўся шараваць пасудзіну, нібыта гэта прывычная яго работа.

Вывучаць жыццё для Янкі Брыля азначае не толькі назіраць. Вывучаць —значыць дзейнічаць, думаць і сачыць за дзейнасцю народа па фактах рэальнасці і па дакументах гісторыі. Мне давялося працаваць поплеч з пісьменнікам у архівах Вільнюса, Гродна, Брэста, Слоніма і іншых гарадоў.

Брыль збіраў матэрыял для рамана «Граніца», які па задуме мае быць шырокім палатном жыцця і барацьбы працоўных Заходняй Беларусі. Мушу прызнацца, я часта бянтэжыўся, не могучы датрымаць такога шпаркага тэмпу работы ў архіве, які трымаў мой калега. Адчуваючы гэта, ён чула супакойваў мяне: «Ты ж чытаеш грунтоўна, а я так, проста для агульнага знаёмства». Гэта агаворка не перашкаджала яму падказваць мне важныя факты, якія я «грунтоўна» прапускаў. Гісторыю Беларусі і яе культуры ён ведае дасканала, ён шануе гістарычныя сувязі беларусаў з народамі- суседзямі. У артыкулах і нарысах Янкі Брыля шмат расказваецца пра духоўную сувязь пісьменніка з рускаю і польскаю культурай.

Рэвалюцыйнае падполле, партызанскі рух, сацыялістычнае будаўніцтва ў Заходніх абласцях рэспублікі, два дзяцінствы, чалавечая дружба, хараство роднага краю — вось любімыя тэмы яго твораў. Брыль умее паказаць сваіх герояў у рэчышчы гістарычных падзей і ў кантэксце сучаснасці. Такія творы Янкі Брыля, як «У Забалоцці днее», «На Быстранцы», «Галя» і іншыя, праўдзіва адлюстравалі вельмі актуальныя пытанні нашага жыцця. Вакол іх вяліся літаратурныя спрэчкі, яны атрымалі шырокае прызнанне грамадскасці і былі высока ацэнены як мастацкае сцвярджэнне жыцця беларускага народа. За аповесць «У Забалоцці днее» пісьменнік быў удастоены Дзяржаўнай прэміі.

Творчасць Янкі Брыля з'яўляецца самабытным сцвярджэннем духоўнага багацця беларускага народа, яго самавітага нацыянальнага характару, побыту, звычак, пявучае, шчырае мовы. Далёка за межы нашай рэспублікі нясуць творы самабытнага беларускага пісьменніка гордую праўду аб нашым народзе, народзе-партызане, народзе-працаўніку, народзе, які на будоўлях сацыялізма і камунізма разгарнуў свае сілы.

Літаратурны шлях Янкі Брыля, як і кожнага таленавітага мастака, толькі знешне лёгкі і бліскучы. Гэта лёгкасць даецца цаною страшэннага духоўнага напружання, цаною тытанічнае працы. Я помню вечары, калі Янка Брыль па раздзелах чытаў у вузкім коле сяброў і знаёмых аповесць «У Забалоцці днее», апавяданні з цыкла «Ты мой лепшы друг» і іншыя творы. Гэта было ў гады літаратурнай маладосці. Голас пісьменніка выдаваў хваляванне, а ў моцных руках аркуш паперы дрыжаў, і аўтар стараўся перахапіць яго пальцамі пасярэдзіне, каб непрыкметна была трывога. З такім жа неспакоем, клопатам і нават страхам чытае новыя рэчы свае і прызнаны майстра Іван Антонавіч Брыль. З гэтай трывогі, якая дапамагае знаходзіць праўду і хараство жыцця, нараджаецца славуты лірызм прозы пісьменніка. Лірызм гэты на самай грані чуллівасці стрымліваецца брылёўскім гумарам. Лірызм ідзе ад чулага ўражлівага сэрца і крылатай фантазіі; гумар, мабыць, ад разважлівасці і пачуцця рэальнасці.

Янка Брыль — пісьменнік вялікага сэрца, чалавек шчодрай высакароднай душы і крыштальна чыстага сумлення. Ён любіць жыццё і людзей. Любоў гэта моцная, але не сляпая. Навучыцца і навучыць другіх любіць жыццё разумна —вось яго запаветная мэта. Тут пісьменнік бачыць крыніцу сапраўднай радасці. Дзеля гэтай радасці, якою яму хочацца адарыць свет, так натхнёна і самаадцана працуе самабытны мастак слова.

Шчаслівая думка прыйшла земляробам Лідчыны, калі яны вылучылі Янку Брыля кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ

ПРАСТРЭЛЕНЫ КАЦЯЛОК

З ЦЫКЛА «БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ»

Туман на досвітку падняўся да аблок
І цішыня трывожная лягла над Бугам.
Прабіла куля пачарнелы кацялок,
Калі салдат вады зачэрпваў ім для друга.

Жывое вільгаці салдат глыток прынёс,
Сухія вусны ажылі, пагасла ў сябра смага.
І рэха голас кулямёта ўзняла да нябёс,
І непахіснаю была салдацкая адвага.

Каб памяць пра сяброў не ўмерла праз вякі,
Рэліквія—прабіты кацялок ляжыць ў музеі.
Ім чэрпалі ваду жывую з памутнелае ракі,
Бяссмерце чэрпалі ў дні страшнае падзеі.

ПАДПІСКАЙ ТРЭБА КІРАВАЦЬ

У канцы снежня мінулага года ў кантору «Саюздруку» Ленінскага раёна горада Мінска прыйшоў работнік адной бібліятэкі і, паклаўшы перад начальнікам паперу, уздыхнуў:

— Прашу ануляваць падпіску на некаторыя газеты і часопісы. Скарацілі нам сродкі на гэтую справу...

Цяпер я міжволі прыпомніў гэты выпадак і рашыў прааналізаваць вынікі падпіскі на літаратурна-мастацкія выданні. Узяўшы некалькі назваў асноўных «тоўстых» часопісаў, я параўнаў тыражы мінулага года і сёлетняга. Параўнанне гэтае паказала, што сёлета падпісчыкі рэспублікі будуць атрымліваць значна больш літаратурна-мастацкіх часопісаў. Выраслі, напрыклад, тыражы «Полымя», «Немана», «Маладосці», «Дружбы народов», «Нового мира», «Роман-газеты», «Октября», «Невы» і г. д. Увогуле падпіска на асноўныя літаратурна-мастацкія часопісы павялічылася больш чым на шэсць тысяч экземпляраў.

Лепш за ўсіх правялі падпіску на «тоўстыя часопісы» сувязісты і грамадскія распаўсюджвальнікі друку Гомельскай вобласці. І гэта не выпадкова. Кіраўніцтва Гомельскага абласнога аддзела распаўсюджвання друку (начальнік В. Кісялёў) перад адкрыццём падпіскі і ў ходзе яе правяла вялікую арганізацыйную работу, наладзіла шырокую рэкламу часопісаў.

Гэтага, на жаль, не скажаш пра работнікаў Гродзенскага і Брэсцкага аддзелаў распаўсюджвання друку. Падпіскай тут ніхто не кіраваў. І ў выніку — значна скарацілася колькасць падпісчыкаў на літаратурна-мастацкія часопісы. Напрыклад, у Брэсцкай вобласці сёлета выпісана часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Неман» на дзевяцьсот экземпляраў менш, чым у мінулым годзе. «Неман», у прыватнасці, паступае сёлета ў вобласць на 563 экземпляры менш, чым летась.

— Бібліятэкі скарацілі падпіску, — скардзіцца начальнік Брэсцкага аддзела распаўсюджвання друку Б. Сіліцкі.

Так, сапраўды, у нейкай меры бібліятэкі скарацілі падпіску на часопісы. Аднак гэта не можа быць апраўданнем! Гамяльчане ж здолелі павялічыць колькасць падпісчыкаў. Ды і не толькі гамяльчане! Справа — у арганізацыйнай рабоце, у зацікаўленасці.

Нельга таксама пагадзіцца з загадчыкамі тых бібліятэк, якія, матывуючы тым, што скарочаны сродкі на набыццё літаратуры, у першую чаргу адмаўляюцца выпісваць нашы літаратурна-мастацкія часопісы. Больш таго, амаль да недарэчнасці дайшлі органы Міністэрства асветы БССР, якія ў рэкамендацыйны спіс перыядычных выданняў для бібліятэк сярэдніх і васьмігадовых школ не ўключылі «тоўстыя» часопісы і газету «Літаратура і мастацтва». Калі ісці па гэтым шляху і далей, дык можна забараніць школьным бібліятэкам набываць і мастацкую літаратуру!

У гэтыя дні праводзіцца падпіска на другі квартал 1963 года. Работнікі «Саюздруку», сувязі, а таксама культасветустановам неабходна не толькі аднавіць колькасць падпісчыкаў на літаратурна-мастацкія выданні, але і значна павялічыць яе. Вялікую дапамогу ў гэтай справе павінны аказаць рэдакцыі і выдавецтвы. Іх актыўны ўдзел у прапагандзе сваіх выданняў будзе садзейнічаць росту падпісчыкаў, а, значыць, і тыражоў.

М. ПАЛУНІЧАЎ,
начальнік аддзела падпіскі Упраўлення распаўсюджвання друку Міністэрства сувязі БССР.

ДОБРА, ХУТКА, ЭКАНОМНА

Работнікі прафсаюзных бібліятэк дывановага камбіната і шаўкаткацкай фабрыкі горада Віцебска актыўна памагаюць інжынерна-тэхнічным работнікам, перадавікам вытворчасці, наватарам і рацыяналізатарам, прапагандуючы вопыт лепшых рабочых П. Клімкова, А. Кізікава, Г. Іванова, М. Працасені, К. Ярашэвіч і інш.

Аднойчы начальнік тэхнічнага аддзела дывановага камбіната Я. Казарноўскі прапанаваў загадчыцы бібліятэкі прадпрыемства В. Далінгер:

— Добра было б правесці канферэнцыю чытачоў аб тым, як хутчэй працаваць, эканоміць сыравіну, зніжаць сабекошт дываноў.

Прапанова спадабалася. За парадай, як лепш правесці такую канферэнцыю, В. Далінгер звярнулася ў гарадскую бібліятэку імя А. С. Пушкіна. Вырашылі арганізаваць канферэнцыю сумесна з бібліятэкай шаўкаткацкай фабрыкі.

І вось тры бібліятэкі аднаго раёна г. Віцебска — гарадская імя А. С. Пушкіна, дывановага камбіната і шаўкаткацкай фабрыкі — пачалі рыхтаваць канферэнцыю чытачоў, якую назвалі: «Працаваць добра, хутка, эканомна».

Бібліятэчным работнікам памаглі начальнік тэхнічнага аддзела дывановага камбіната Я. Казарноўскі, начальнік тэхнічнага аддзела шаўкаткацкай фабрыкі М. Зеліковіч і начальнік рамонтна-механічнага аддзела фабрыкі Ул. Янчанка. У бібліятэках быў падабраны адпаведны матэрыял, наладжаны кніжныя выстаўкі, у цэхах вывешаны плакаты з запрашэннем прыняць удзел у канферэнцыі. Загадчыцы бібліятэк В. Далінгер і В. Іваноўская правадзілі агляды эканамічнай літаратуры, цэхавыя віктарыны па эканоміцы, шырока прапагандавалі часопіс «Рационализатор и изобретатель», «Экономическую газету» і іншую літаратуру.

Такая сур'ёзная падрыхтоўка прынесла добрыя вынікі. Выступленні ўдзельнікаў канферэнцыі былі вельмі цікавыя. Так, дыспетчар дывановага камбіната тав. Хвастоў расказаў аб тым, якім чынам можна дасягнуць больш высокай прадукцыйнасці працы. Пра тое, як моладзь камбіната асвайвае новую тэхніку, як памагае ёй у гэтым тэхнічная і эканамічная літаратура, гаварыла маладая работніца камбіната Алена Місурыгіна. Слесар шаўкаткацкай фабрыкі В. Кухараў падзяліўся сваімі думкамі. Ён, у прыватнасці, расказаў, што на фабрыцы за кошт мадэрнізацыі плюшавых станкоў змаглі без павелічэння вытворчай плошчы дадаткова паставіць 16 станкоў і значна павысіць прадукцыйнасць працы.

— За мінулы год, — працягваў В. Кухараў, — на фабрыцы было ўкаранёна 105 рацыяналізатарскіх прапаноў. У гэтым нашым вынаходнікам вялікую дапамогу аказала тэхнічная літаратура.

Думаецца, што падобная канферэнцыя павінна зацікавіць работнікаў усіх прафсаюзных бібліятэк. Такія канферэнцыі памогуць ім правільна зразумець пытанні павышэння прадукцыйнасці працы, укаранення новай тэхнікі і тэхналогіі, узаемасувязі паміж асобнымі вытворчымі працэсамі, ясна ўявіць сабе тое, у што абыходзіцца прадпрыемству выпускаемая прадукцыя.

А. МЕЛАМЕД,
галоўны бібліятэкар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна.

ІДЭІ ЧАСУ, ФОРМЫ ЧАСУ

(Пачатак на 1-й стар.).

І гэта не дзеля таго, каб чытаць чарговую лекцыю па фізіялогіі раслін, а каб дайсці да нечаканай высновы значнага сацыяльнага гучання:

Мы ведаем два колеры жыцця:
зямлёй і сонцам створаны — зялёны,
зямлёй і сэрцам выснены — чырвоны,
мы ведаем, чаму чырвоны
сцяг.

Сучасны лірычны герой гаворыць сваё шчырае разумнае слова пра свой час, ён не толькі грамадзянін, але і інтэлектуальна развіты чалавек. І такога героя можа стварыць толькі паэт высокага інтэлекту і мастацкага густу, які заклапочаны, каб «в просвещении стать с веком наравне».

Чытаючы першую кніжку маладога паэта А. Наўроцкага «Неба ўсміхаецца маланкай», не застаешся абыякавы, бо ў ёй бачыш плён неўтаймоўнай працы думкі, вялікай усхваляванасці сэрца, непадкупную шчырасць пачуццяў. А шчырая ўсхваляванасць заўсёды ў спрэчцы з банальнасцю, датычыць гэта думкі ці формы яе выказвання.

Сонечны прамень, які мяшаюць разам з цукрам у шклянцы чаю; дзіця, народжанае ў агні бою, якое закрычала на ўсю Еўропу; гара акрываўленых бінтоў, што вырасла над светам, як вынік атамнай бамбардзіроўкі Хірасімы, — усё гэта вобразы не толькі змястоўныя, але і адчувальныя ў сваёй канкрэтнасці. Яны прымушаюць самага абыякавага да паэзіі чытача ўздрыгануцца, задумацца, затрывожыцца, бо паэт крык сваёй набалелай душы ўзнімае да вышынь грамадзянскага пратэсту супраць няспраўядлівасцей, якіх яшчэ многа на свеце.

Палымяную грамадзянскую пазіцыю займае паэт і ў вершы «Размова з Уладзімірам Ільічом», калі, гаворачы пра Сталіна, раскрывае вялікую праўду тых, хто змагаўся за жыццё на зямлі:

Паміраючы за яго на полі бою.
Ведайце —
Памiралі за Вас.

А. Наўроцкі не ўмее, а больш правільна — не можа прыглушаць сваю размову паўтанамі, у яго часам залішне рэзкіх таноў, але ў гэтым і арыгінальнасць паэтычнага мыслення аўтара. Яго пачуцці—вынік не сузірання, а мыслення. Паэт ступае на літаратурную ніву цвёрдым крокам, хоць і ўзбіваецца часам на шлях аголенага натуралізму, перапеваў ужо чутага ці пазбаўленай выразнага сэнсу словавязі («Яйка», «Дзве дарогі сому», «Слухаю рэха»). І зусім апраўданы тыя засцерагальнікі, якія ставіць крытыка на гэтых малаплённых сцежках. Але ж ці варта патрабаваць ад паэта немагчымага: паказаць усю сур'ёзнасць і складанасць узнікнення культу Сталіна, як пра тое піша Б. Бур'ян у артыкуле «На арбіту эпохі». Нельга не лічыцца з магчымасцямі жанра і канкрэтнасцю паэтавай задумы.

Калі чытаеш вершы А. Наўроцкага, адчуваеш нейкія вечныя турботы паэта, здаецца, ім і канца не будзе. Вось чаму верыш, што крокі яго будуць станавіцца яшчэ цвярдзейшыя з кожным годам узмужнеласці паэта як грамадзяніна і мастака.

Сёння, як ніколі раней, патрэбна паэзія вялікай думкі і смелага парыву сэрца. Мінула пара красамоўных агульных заклікаў, рытарычных паўтораў. Слова вырасла ў цане, бо на справе пачалі мы паважаць годнасць чалавека. І як бы ні кпілі некаторыя з тых, хто сцягам сённяшняй паэзіі робіць няспынныя пошукі, стыхія глыбокай думкі і «мыслящего чувства» возьме верх над прыземленасцю, традыцыяналізмам, аголенасцю пачуццяў. Сёння мала для паэта фанабэрыцца тым, што ён умее адрозніць авёс ад ячменю. Трэба ведаць куды больш, каб заставацца на ўзроўні часу, нават у паказе быту, не кажучы ўжо пра тое, каб змагацца за сапраўдную народнасць у паэзіі, якая не адно толькі ў рыфме «шкадую—склюдую», а перш за ўсё ў тым, што «чалавек — сусвету цар!».

Гаворка тут ідзе не пра адмаўленне нацыянальных традыцый, да якіх вельмі чулая беларуская паэзія і якія між іншым трывала ўваходзяць у творчасць самых маладых, самых арыгінальных нашых паэтаў. І мусіць жа нацыянальны склад іх мыслення засцерагае ад захаплення заходняй буржуазнай модай у мастацтве, ад нявольніцкага перамання мадэрнісцкіх уплываў. А тое, што паасобныя пісьменнікі не праходзяць міма індывідуальнага вопыту некаторых прадстаўнікоў мадэрнізму і нават крытычна скарыстоўваюць яго, не азначае прызнання сумяшчальнасці мадэрнісцкіх тэндэнцый з рэалістычнай асновай нашай літаратуры. Гутарка ідзе аб тым, што і нацыянальныя традыцыі не закасцянелая з'ява ў мастацтве, а жывая, на якую ўплываюць сацыяльныя зрухі ў грамадстве.

Навукова-тэхнічны прагрэс, якім ахоплена ўся наша краіна, горад і вёска — бо толькі такі найкарацейшы шлях да стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма — выклікае неабходнасць паглыблення інтэлектуальнага зместу мастацтва. Чытач шукае сёння ў вершы не толькі душэўнасці, але і сапраўднай духоўнай узвышанасці. Бачыць задачу паэзіі ў апяванні бяздумных краявідаў і запаўненні лісткоў сямейнага альбома — значыць заставацца ў палоне шэрага правінцыялізму. Сёння чытача ўжо мала хвалюе тое, што паэт, апынуўшыся ўдалечыні ад роднай зямлі, успамінае «сцяжынку-пуцявінку», выхаджаную ў дзяцінстве басанож. З удзячнасцю ўспрыме чытач ад паэта толькі яго шчырую ўсхваляванасць магутнасцю розуму савецкага чалавека, які не адно сузірае багацці прыроды, памнажае іх, але і перайначвае маральныя асновы грамадства, імкнучыся быць не тым, кім з'явіўся на зямлі.

Традыцыйная ў беларускай паэзіі прыхільнасць да фальклорнай асновы пачынае часам і надакучаць, асабліва ў тых паэтаў, дзе гэтая аснова не развіваецца далей паэтычнай дэталі, народнай сімволікі, бытавой дакладнасці вобраза, лексічных і фразеалагічных запазычванняў. Чэрпаць з гатовага арсенала—хай гэта будзе фальклор, успаміны дзяцінства, прыём банальных паўтораў, быт вясковай хаты, двара і ваколіцы — куды лягчэй, чым турбавацца пра пазнанне ўсёй разнастайнасці сённяшняга жыцця чалавецтва. А толькі ж такое пазнанне здольна выклікаць душэўную актыўнасць, грамадзянскую ўсхваляванасць.

Фальклор — гэта ў літаратуры, як падмурак. Але ж адзін падмурак — яшчэ не дом. У сучасным доме абавязкова павінны быць паверхі. Так і ў літаратуры сацыялістычнага рэалізму павінны «нарошчвацца» ўсё новыя, па-мастацку ўзноўленыя пласты жыцця чалавека, які крочыць у нагу з векам. Ехаць з накладзеным возам па добра наезджанай каляіне «і лёгка, і не дрогка», але ж хіба такая «язда» можа задаволіць сапраўднага мастака слова, які дбае пра тое, каб беларуская літаратура і далей была народная, рэалістычная, нацыянальная. На адным, якое б яно ні было творчае, скарыстанні багаццяў народнай творчасці, далёка не заедзеш, тым больш, у «незнаемов». Патрэбна заглыбленне ў бездань сучаснай думкі, патрэбна засваенне вопыту больш развітых літаратур, патрэбен клопат пра форму. Калі не рабіць захадаў у гэтым кірунку, нацыянальнае можа дакаціцца да правінцыяльнага. Так можа ўзнікнуць здрабненне зместу, шэрасць і прымітывізм формы, «эмацыянальная непісьменнасць» — усё тое, што нецярпіма для мастацтва сацыялістычнага рэалізму.

«Зробім традыцыяй пошукі!» — гэта не заклік аднаго М. Стральцова, гэта закон класічнага мастацтва. Вось чаму да гэтага закліку варта было б дадаць: **не будзем забывацца на традыцыі,** бо пошукі заўсёды былі лепшай традыцыяй сапраўднага мастацтва. І мусіць не варта, як тое робіць М. Стральцоў, забягаць у сваіх разважаннях так далёка, адрывацца ад практыкі літаратуры і жыцця. Ніякага распаду старых, «класічных» форм не толькі ў мастацтве, але ў навуцы і тэхніцы няма. Ёсць пэўная «ўстойлівасць» першапачатковага, «изначального», у кожнай форме. Без «класічнай», агульнай фізікі не была б створана Эйнштэйнам яго тэорыя адноснасці, дом ужо каторае стагоддзе застаецца месцам жыцця чалавека, а слова, як і раней — матэрыял і інструмент пісьменніка. Пошукі ідуць больш у напрамку ўдасканалення старых форм, абнаўлення іх, творчага «прыстасавання» да новага зместу, здабыцця новага сэнсу.

Нельга адмаўляць старое толькі таму, што яно ўзнікла не ў наш час. Тым больш нельга рабіць гэта так груба, як паспрабаваў В. Говар, кіруючыся чыста суб'ектыўным успрыманнем, закрэсліць Шостую сімфонію Чайкоўскага, бо ў клавіры яна, бачыце, будзе гучаць вельмі бедна. Дык у клавіры і музыка да кінафільма «Чалавек ідзе за сонцам» страціць сваю лёгкасць і празрыстасць. Не аркестраваная сімфонія перастае быць сімфоніяй. І гэта не дае ніякіх падстаў адмаўляць сінтэтычнае мастацкае мысленне, жывапіснасць фарбаў і кананізаваць «больш вольную форму» размовы з чытачом, гледачом, слухачом.

Гаворка пра форму можа ісці толькі канкрэтна, у сувязі з пэўнай задумай мастака і сродкамі яе рэалізацыі. Ніхто не вымагае сёння араць сахой, але слова «саха», як выражэнне пэўнага зместу, існуе і ўжываецца, калі гэта апраўдана. І ўжо ж дзіўна, як часам бывае, клопат мастака пра форму залічаць да фармалізму. Фармалізмам такі клопат становіцца тады, калі ў мастака знікае адчуванне ідэйнага зместу жыцця і ідэалагічнага ўспрыняцця створанага ім. У мастака-рэаліста клопат пра форму амаль заўсёды ператвараецца ў вельмі сур'ёзную праблему, бо ён бачыць яе, як гарманічную адпаведнасць зместу. І ці варта так безапеляцыйна сцвярджаць: «Я не думаю, што А. Салжаніцын пачаў з пошукаў стылявых сродкаў, а не з роздуму аб жыццёвай з'яве, якая яго ўсхвалявала» (Я. Герцовіч)?

Пра першую кніжку пісьменніка

ВЫРАШАЛАСЯ ГАЛОЎНАЕ...

Аляксандр МІРОНАЎ

Шмат кніг, добрых і розных, напісана пра гераічную барацьбу савецкіх патрыётаў у тыле ў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Многія з іх назаўсёды палюбіліся чытачам, будуць хваляваць праз гады і дзесяцігоддзі. Новыя пакаленні грамадзян нашай краіны вучацца на такіх творах любві да Айчыны і гатоўнасці да апошняга дыхання змагацца за свабоду і незалежнасць яе.

Кожную новую кнігу аб партызанскай і падпольнай барацьбе ў тыле фашыстаў бярэш у рукі з вераю, што кніга гэтая раскажа табе нешта новае, дагэтуль невядомае пра той час. І як жа бывае радасна, калі спадзяванне гэтае спраўджваецца!

Спраўдзілася яно і для чытачоў першай кнігі маладога празаіка Мікалая Кругавых — рамана «Чэсць ярма не прымае», выпушчанага нядаўна Дзяржаўным выдавецтвам БССР.

Аўтар гэтага рамана старшына М. Кругавых дваццаць год ужо служыць у радах Савецкай Арміі. Пачаўшы службу ў цяжкія гады Айчыннай вайны, ён і сёння стаіць на баявой варце нашай Радзімы. Глыбокая любоў да літаратуры, пастаянная ўвага і творчая падтрымка беларускіх пісьменнікаў памаглі маладому празаіку стварыць гэту кнігу. Мікалай Кругавых, ураджэнец Растоўскай вобласці, назаўсёды звязаў сваё жыццё з беларускай зямлёй, якая стала для яго роднай.

Шмат падзей, шмат герояў і персанажаў у рамане М. Кругавых, хоць плошча, «тэрыторыя» яго амаль цалкам абмяжоўваецца рамкамі невялікага хутара Крамяннога ў прасторах Сальскіх стэпаў. Толькі зрэдку аўтар вядзе чытачоў у суседнія хутары, у станіцу Мінарэтную, дзе размясцілася фашысцкая камендатура і жудасны гестапаўскі засценак. Усе ж галоўныя падзеі і адбываюцца, і развіваюцца ў хутары Крамянным. Такая абмежаваная «тэрытарыяльнасць» магла прывесці аўтара, міма яго волі, і да абмежаванасці мастацкай. Але, на шчасце, гэтага не здарылася: раман «Чэсць ярма не прымае» — твор шматпланавы, аб'ёмны і ў гэтым — бясспрэчная ўдача М. Кругавых.

Звяртае ўвагу і тое, што раман напісаны строгай, лаканічнай, даступнай мовай. М. Кругавых паступова, штрых за штрыхам выпісвае вобразы і характары сваіх герояў. Няма сярод іх ніводнага, які б не развіваўся ў дзеянні, а прыйшоў у раман ужо гатовым, сфармаваным раней, да пачатку апісаных аўтарам падзей, а больш дакладна — да вялікіх выпрабаванняў Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя выпрабаванні прымусілі кожнага і нанава пераглядзець усё сваё ранейшае жыццё, і зусім нанава, на новы лад, на лад барацьбы з ворагам настроіць свае думкі і пачуцці. Бо вырашалася самае галоўнае ў жыцці народа ў тую цяжкую гадзіну выпрабаванняў: быць нам свабоднымі ці навекі стаць рабамі іншаземцаў. А адказ на гэтае пытанне людзі маглі знайсці толькі ў барацьбе з ворагам.

Шукалі адказу ўсе: і зусім яшчэ маладыя, што толькі-толькі пачыналі жыццё — камсамольцы хутара Крамяннога — Сяргей Вінюкатаў, Воўка Чалы, Ілько Купрыянаў, Валя Шчарбіна, Міця Крывянькоў, іх таварышы і сябры; і такія, як старшыня стэпавага калгаса Якаў Макаравіч Дзіеў, стары калгасны каваль Павел Ферапонтавіч Агійчанка і іх аднавяскоўцы. Шукалі адказу, арганізоўваючы і ўзначальваючы барацьбу з крывавымі захопнікамі, партыйныя кіраўнікі — сакратар падпольнага райкома Кошалеў і член бюро Гудзенка.

І пісьменнік паказвае, іменна паказвае, а не апісвае, як у гэтай барацьбе мужнелі, духоўна раслі, станавіліся героямі радавыя сыны і дочкі савецкага народа.

Не здрадзіў густ аўтару рамана і там, дзе ён гаворыць пра ворагаў. У творы М. Кругавых няма хадульных, адштампаваных раз і назаўсёды, стандартызаваных гітлераўцаў і паліцаяў, якія яшчэ вандруюць часам па кніжных старонках. У былога калчакоўскага афіцэра Крайнюка, які люта ненавідзеў усё наша, савецкае, і з радасцю пайшоў на службу да акупантаў, — свой характар, свае імкненні і спадзяванні. Яго не зблытаеш са Шчарбінаю, які хоць і па іншых прычынах, але таксама паспяшаўся прадацца фашыстам. Пераканальна паказвае М. Кругавых і шляхі, якія прыводзяць Крайнюка і Шчарбіну да здрады.

Такія, на мой погляд, несумненныя вартасці рамана «Чэсць ярма не прымае». І тым больш кідаюцца ў вочы недахопы гэтай кнігі. Іх, праўда, не так ужо многа, але не сказаць пра іх нельга.

Першы з гэтых недахопаў — цэлы рад выпадковасцей, дапушчаных аўтарам у сюжэтнай тканіне твора. На першы погляд, яны могуць здацца не зусім істотнымі: бо магло быць і так! Але сама логіка фактаў, само жыццё і барацьба патрыётаў хутара Крамяннога гавораць аб тым, што аўтар не ўсё як след у рамане прадумаў. Выпадак, нават незвычайны, нерадавы мае права на месца ў рамане; аповесці, апавяданні пры ўмове, аднак, калі ён апраўданы развіццём сюжэта твора. У М. Кругавых жа вельмі многа выпадковасцей.

Выпадкова, бязглузда, з-за двайной сваёй памылкі гіне ад рук гестапаўцаў цудоўны хлопец Валодзька Чалы. Выпадковая сустрэча з фашыстамі ў начным стэпе абрывае жыццё камсамольца Ілька і яго каханай. Выпадковая аблава на рынку прыводзіць Васіля Паха ў гітлераўскі засценак, і зноў-такі выпадковая памылка ката ў час расстрэлу выратоўвае яму жыццё. Больш таго: нават падпольшчык, старшыня калгаса камуніст Дзіеў і той зусім выпадкова даведваецца пра стварэнне падпольнай камсамольскай арганізацыі ў хутары Крамянным.

І заканчваецца твор дзвюма выпадковасцямі: першая з іх — гібель «двух скарпіёнаў у слоіку» — Крайнюка і Шчарбіны — у час бурану ў стэпе, і другая — гібель каваля Агейчанкі ад шалёнай кулі ў ноч, калі нашы войскі атакуюць яго родны хутар. Калі яшчэ з гэтай, другой, выпадковасцю можна неяк пагадзіцца, дык першая выклікае рашучы пратэст: бо не кара народная, не справядлівы суд незлічоных ахвяр Крайнюка і Шчарбіны абарвала жыццё гэтых падонкаў, а сляпая сіла прыроды — буран. І справядлівая помста, такім чынам, абмінула іх.

Ёсць у рамане і іншыя хібы. Так, напрыклад, хочацца запытацца, навошта Сяргей Вінюкатаў прымусіў здрадніка Шчарбіну падпісаць клятву, што ён, Шчарбіна, больш не будзе служыць акупантам? Клятва ж так і не «выстраліла», не адыграла ніякай ролі. Аўтар нібы забыўся пра яе, а Шчарбіна і далей выдаваў падпольшчыкаў, нават (няхай таксама выпадкова) уласную дачку камсамолку Валю. Дзеля чаго, у імя чаго падпольшчыкі падкідалі Крайнюку пісьмы з пагрозаю разлічыцца з ім, калі яны так і засталіся толькі пагрозамі, а Крайнюк амаль сярод белага дня ўцёк з Крамяннога? Як мог сакратар падпольнага райкома партыі Кошалеў не ведаць, што ўяўны паліцай Міхаіл Гудзенка з'яўляецца членам бюро таго ж самага, узначальваемага Кошалевым, бюро райкома?

Падобных пытанняў пры чытанні рамана ўзнікае нямала.

Можна, вядома, спрачацца з аўтарам гэтых заўваг, можна не пагаджацца з ім. Тым больш, што, паўтараю, у цэлым раман М. Кругавых — цікавы твор. Але менавіта таму, што ён сапраўды глыбока хвалюе, я і спыняюся на недахопах. Упэўнены, што гэты твор знойдзе цёплы прыём у многіх і многіх чытачоў. Прыйдзе час, калі ўзнікне неабходнасць новага выдання рамана. І хочацца, каб Мікалай Кругавых улічыў сяброўскія заўвагі і яшчэ і яшчэ раз патрабавальнай рукой прайшоўся па старонках кнігі.

САЛДАТЫ АРМІІ МІРУ

У ПАКОІ для заняткаў удзельнікаў студыі выяўленчага мастацтва было ціха і, зразумела, нешматлюдна. Пазнаёміліся: малодшы сержант Аляксандр Ільін, радавыя Уладзімір Харонак і Валерый Белы, лейтэнант Генадзь Баранаў.

Розныя гэта людзі. Валерый да прызыву ў армію працаваў дрэвамадэльшчыкам на Мінскім аўтазаводзе, Аляксандр — «сын палка», выхаванец дзіцячага дома і ансамбля БВА. Генадзь родам з Бабруйска, выхаванец Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча. І толькі Уладзімір быў да арміі нейкім чынам звязаны з мастацтвам: працаваў памочнікам рэстаўратара ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.

Сюды, на заняткі ў студыю выяўленчага мастацтва, прывяла іх вялікая любоў да прыгожага, да таго, што завецца светлым словам мастацтва.

Кіруе вучобай студыйцаў нядаўні выпускнік Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Віктар Варламаў. І няхай ён пакуль што не можа пахваліцца асаблівымі поспехамі сваіх выхаванцаў: з пачатку заняткаў мінула не так і многа часу. Радуе іншае: іх шчырае жаданне пазнаць сакрэты сапраўднай творчасці, іх душэўная адданасць любімай справе.

ЗАЎСЁДЫ РАЗАМ

45-годдзе Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, якое 23 лютага адзначае краіна, у гэтым годзе супадае з яшчэ адной знамянальнай датай — 40-годдзем шэфства работнікаў мастацтва над Узброенымі Сіламі. Па закліку сэрца мастакі, кампазітары, паэты, пісьменнікі, работнікі тэатра і кіно нясуць культуру воінам Савецкай Арміі, удзельнічаюць у важнай справе іх эстэтычнага выхавання, памагаюць у арганізацыі і кіраўніцтве мастацкай самадзейнасцю ў часцях і падраздзяленнях.

Тэма Савецкай Арміі на працягу ўсёй яе гераічнай гісторыі з'яўляецца адной з асноўных у савецкім мастацтве. На барацьбу за маладую Рэспубліку Саветаў заклікалі чырвонагвардзейцаў першыя патрыятычныя плакаты Д. Моора, «Вокны РОСТА», у якіх удзельнічалі паэт і мастак Ул. Маякоўскі і мастак М. Чарамных, вострa сатырычныя карыкатуры В. Дзені. У гісторыю савецкага выяўленчага мастацтва ўвайшлі славутыя агітпаязды, якія ствараліся ў тыя гады і адыгрывалі значную ролю ў агітацыйнай рабоце партыі. Адзін з іх, вядомы на шматлікіх франтах агітпоезд «Кастрычніцкая рэвалюцыя», быў распісаны малюнкамі, карыкатурамі, лозунгамі і плакатамі, якія выканалі мастакі Ул. Маякоўскі, Б. Кустадзіеў, М. Чарамных, С. Малюцін і іншыя. У гэтым поездзе выязджалі на франты М. Калінін, Я. Свярдлоў, А. Луначарскі, Дзям'ян Бедны.

З Чырвонай Арміяй звязана імя аднаго з вядомых савецкіх баталістаў — Мітрафана Грэкава, які добраахвотнікам прайшоў з арміяй яе гераічныя шляхі і пакінуў нам гістарычны летапіс грамадзянскай вайны. У гэты ж перыяд да гісторыка-рэвалюцыйных тэм звярталіся Ф. Багародскі, П. Сокалаў-Скаля, К. Пятроў-Водкін, С. Малюцін, А. Асмеркін, А. Дэйнека, скульптары У. Шадр і інш. Побач з імі стваралі свае творы аб арміі беларускія мастакі — А. Грубэ, А. Булычаў, М. Эндэ, В. Руцай і іншыя, карціны якіх знаходзяцца цяпер у дзяржаўных мастацкіх музеях краіны.

У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны савецкія мастакі працягвалі слаўныя традыцыі сваіх старэйшых калег. Да гэтага часу выяўленчая студыя імя Грэкава з самадзейнай вырасла ў прафесіянальную. Маладыя мастакі Б. Няменскі, Б. Авакумаў, Б. Прарокаў, В. Багаткін, Л. Сарфейціс, М. Жукаў, М. Маторын, М. Самсонаў, Б. Яфімаў і іншыя ад пачатку і да канца вайны знаходзіліся на перадавой, збіраючы багаты натурны матэрыял. Накіды, малюнкі, жывапісныя эцюды, эскізы, створаныя на франтах, паслужылі асновай для стварэння шматлікіх вядомых твораў савецкага выяўленчага мастацтва, якія адлюстроўвалі гераічную эпапею.

На франтах, у партызанскіх атрадах і ў тыле ў гады вайны стваралі свае творы беларускія мастакі, удзельнічаючы сваім мастацтвам у барацьбе беларускага народа з фашысцкімі захопнікамі. У 1943—44 годзе іх карціны, графічныя лісты і скульптуры былі сабраны ў Маскве і экспанаваны ў залах Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі. У гэтай ваеннай выстаўцы ўдзельнічалі мастакі З. Азгур, І. Ахрэмчык, М. Беляніцкі, А. Бембель, В. Цвірка, А. Глебаў, З. Паўлоўскі, П. Гаўрыленка, а таксама аўтары гэтых радкоў і многія іншыя нашы калегі. Грамадскасць сталіцы і друк добра сустрэлі беларускую мастацкую выстаўку. Творы, экспанаваныя на ёй, з'явіліся потым асновай для стварэння мастацкага музея ў Мінску.

Ваенная і партызанская тэматыка займала належнае месца ў беларускім выяўленчым мастацтве і пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. На пасляваенных выстаўках з'явіліся такія работы, як «Рэйд Каўпака» Н. Воранава, «Партызаны ў разведцы» Я. Ціхановіча, «Размініраванне» М. Беляніцкага, «Абаронцы Брэсцкай крэпасці» І. Ахрэмчыка, «Непакораныя» В. Цвіркі, «Рускія прыйшлі» К. Касмачова, «Выступленне Мяснікова» А. Кроля, «Прысяга» Х. Ліўшыца, «Клятва танкістаў» М. Манасзона, партызанскія франтавыя замалёўкі С. Лі, А. Шаўчэнкі. Цэлую серыю партрэтаў герояў Вялікай Айчыннай вайны стварылі скульптары З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў і іншыя.

Вялікае месца займае тэма жыцця і быту Савецкай Арміі і на сённяшніх выстаўках. Разам з тым беларускія мастакі вядуць вялікую грамадскую выхаваўчую работу ў Савецкай Арміі, памагаюць развіццю самадзейнага выяўленчага мастацтва сярод салдат і афіцэраў. Чытаюць лекцыі аб мастацтве, праводзяць гутаркі і сустрэчы ў музеях і на перасоўных выстаўках, у майстэрнях і падраздзяленнях. Мастакі ўдзельнічаюць у афармленні клубаў, ленінскіх пакояў, чырвоных куткоў, стэндаў, дошак гонару і славы. Мастакі-актывісты ваенна-шэфскай работы неаднойчы адзначаліся ганаровымі граматамі, дыпломамі і каштоўнымі падарункамі камандавання.

Зараз праходзіць трохмесячнік культурнага шэфства над арміяй. Ён садзейнічае далейшаму ўмацаванню сувязей паміж творчымі калектывамі і воінскімі часцямі і падраздзяленнямі. Саюз мастакоў БССР сумесна з палітычным упраўленнем штаба БВА праводзіць шырокія мерапрыемствы па эстэтычнаму выхаванню воінаў. Так, нядаўна былі праведзены ў войсках «Дзень мастака». Воінам чыталіся лекцыі па выяўленчаму мастацтву. Расказвалася аб сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з работнікамі культуры.

Актыўна рыхтуюцца беларускія мастакі і да ўдзелу ва Усесаюзнай мастацкай выстаўцы, прысвечанай арміі — «На варце міру», якая адкрыецца ў снежні 1964 года ў сталіцы нашай Радзімы Маскве. Гэта выстаўка дасць магчымасць яшчэ раз прадэманстраваць адзінства, узаемнае ўзбагачэнне і кроўныя сувязі савецкага народа і Савецкай Арміі — апоры міру.

М. ТАРАСІКАЎ,
Я. КРАСОЎСКІ,
мастакі.

ВОІНЫ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ АПОВЕСЦЬ

Гэтымі днямі бібліятэка Мінскага Дома афіцэраў правяла канферэнцыю чытачоў па аповесці Васіля Быкава «Трэцяя ракета».

Першым узяў слова камсамолец сержант П. Бакша.

— Твор «Трэцяя ракета» ўразіў мяне да глыбіні душы, — гаворыць ён. — Усё, што напісана пра бой гарматнага разліку — пераканальна і праўдзіва. У аповесці пісьменніка Быкава чытач бачыць, як было цяжка нашым бацькам і братам перамагаць ворага.

На канферэнцыі выступілі таксама сержант С. Логінаў, афіцэры Ю. Смірноў, І. Абрамаў, В. Зотаў, В. Самойленка, беларускі крытык Р. Бярозкін.

А. МУРЫГІН.

РАДКІ ЛЮБВІ І МУЖНАСЦІ

Тры паэты, тры афіцэры Савецкай Арміі...

Першаму з іх — Фёдару Яфімаву — ужо не патрэбны рэкамендацыі. Летась ён выдаў кнігу вершаў «Армія» і яна была вельмі прыхільна сустрэта чытачом і крытыкай. Ф. Яфімаў — член Саюза пісьменнікаў.

З вялікім цыклам вершаў, таксама прысвечаных арміі, выступіў сёлета ў першым нумары часопіса «Неман» танкіст, старшы лейтэнант Аляксандр Глазырын. Нядаўна ён падрыхтаваў да друку зборнік вершаў. Я чытаў гэты зборнік. Ён сведчыць аб тым, што аўтар яго — цікавы паэт, які ўмее пісаць аб грамадска значным так, каб яно гучала выкліканай уласным сэрцам лірыкай.

І, нарэшце, трэці і самы малады: Генадзь Жукаў, таксама танкіст і таксама старшы лейтэнант.

Армія, пра якую пішуць тры названыя паэты, умее не толькі ваяваць, а і думаць, яна дбае аб міры, як аб найвялікшым шчасці для чалавецтва, і разам з тым гатова нанесці сакрушальны ўдар кожнаму, хто адважыцца пачаць вайну.

Армейская тэма пад пяром А. Глазырына, Г. Жукава і асабліва Ф. Яфімава, самага спелага і таленавітага ў групе нашых армейскіх паэтаў, не вычэрпваецца «статутам службы», яна — і думка, і пачуццё, і быт, і пейзаж, і непаўторная чалавечая характэрнасць, і многае іншае, што складае самую патаемную сутнасць творчай індывідуальнасці паэта. Гэта тэма не спецыфічна «ваенная», гэта тэма — **народная**.

Вядома, нашым армейскім паэтам трэба яшчэ шмат вучыцца, шмат працаваць, каб дасягнуць сапраўднага майстэрства.

Але пачатак зроблены, «заяўка» прагучала. Пажадаем жа маладым сябрам, паэтам, выхаваным гераічнай Савецкай Арміяй, новых поспехаў, новых вершаў, новых кніг.

Рыгор БЯРОЗКІН.

Фёдар ЯФІМАЎ

НА ПАЛІГОНЕ

Пясчаная пустэча палігону,
Сігнальнай гільзы трапяткі набат,
Ды ўздрыганне зямлі, цяжкой
ад звону,
Ды ахінуты пылам далягляд.

Пыл! Толькі пыл наўкол гвалтоўна
ходзіць,
Слупамі падпірае небасхіл,
Нібы на нас з усіх былых
стагоддзяў
Ардою чорнай наступае пыл.

І цягачы, нібыта ў паняверцы,
Да хрыпаты цягнулі грузны гул.
І мы раз-пораз адчынялі дзверцы,
Каб выплюнуць гаркавы чорны мул...

Ды не закрылі орды пылу дрогкага
Ні «ворага», ні нашых пільных воч,
І батарэя, «халастымі» вохкала,
Ажно стагі скакалі ў поле ўзбоч.

Быў кожны залп — як вогненная
кропка.
Выў самалёт — спяшайцеся, стралкі!
І толькі рэха — подскакам
па сопках,
Як па вадзе гарэзы-хлапчукі.

Калі ж сціхала кананада бою,
На «ўзятыя» ішлі мы рубяжы.
Здавалася, у нас над галавою
Снавалі самалётамі стрыжы...

Ад пылу ачмурэлыя і спёкі,
Мы клаліся ў палатках, як кулі...
Плылі высока лебедзі-аблокі,
На крылах неслі цішыню зямлі.

І нібы з печы выцягнуты бохан,
Схаваўшыся ў паўночны сіні цень,
Наўкол зямля заснула сном
глыбокім,
Не менш, як мы, стаміўшыся
за дзень.

Пераклад з рускай мовы
П. МАКАЛЯ.

Аляксандр ГЛАЗЫРЫН

РАЗВІТАННЕ

Узвіся, ракета, трывожным агнём,
Сірэна, у змрок зараві!
Паляцелі на поўдзень
сёння днём,
Пакінулі нас жураўлі.
А на ўсход пайшоў эшалон.
Яму ісці і ісці.
Шчаслівых, сябры, вам дарог і дзён!
Харошых нявест вам знайсці!
У вас за плячыма
нялёгкі багаж, —
Начных трывог гады.
А гэта матыў любімы ваш
Запеў салдат малады.
Дзесьці ўдалі, дзе цямнее тайга,
Там, дзе спляценне трас,
Прыйдзе да вас
успамін-туга
І вы спяеце пра нас.
Успомніце полк,
сяброў галасы...
І, на салдацкі манер,
Заракочуць прастуджаныя басы,
Загудуць на ўвесь кар'ер.
Наўкола кастра —
светлы круг,
Сеснаў марозны звон...
І адгукнецца вам дальні друг —
Воінскі гарнізон.

Пераклад з рускай мовы
А. ВЯРЦІНСКАГА.

Генадзь ЖУКАЎ

ДЗЯЦІНСТВА

Нарадзіўся і вырас
я ў салдацкай сям'і.
Пеў «Кахоўку»,
калі
не было і сямі.
Вось і ўсё,
чым дзяцінства
ў душы паўстае.
Болей ведалі
бацька і маці
мае.
Ды яны не раскажуць
пра тыя гады —
ў сорак першым
замоўклі яны
назаўжды.

Пераклад з рускай мовы.

З АРМЕЙСКІХ ЗАМАЛЁВАК

Д. ІСАЧАНКА. На вучэнні.

Г. СКАМАРОХАЎ. У вольны час.

А хіба не можа быць і так, як успамінае мастачка В. Хадасевіч пра А. М. Талстога? Яны неяк разам хадзілі па лесе. Аляксей Мікалаевіч сарваў звычайную жоўценькую кветку, з любасцю паглядзеў на яе і сур'ёзна сказаў, што ён вельмі шчаслівы чалавек. На пытанне спадарожніцы «чаму?» А. Талстой адказаў: «...вось цяпер, калі я развязаўся з пытаннем формы, я сапраўды стаў шчаслівы! Цяпер можна ўсё аддаваць асноўнай думцы, тэме, гэта значыць галоўнаму». Агульных правіл для пошукаў формы, агульнай формулы станаўлення індывідуальнага стылю быць не можа. Усё дыктуецца задумай і ёю ж вытлумачваецца.

Паўтараць як догму, што новы змест вымагае абавязкова і новай формы, значыць не заўважаць жывога літаратурнага працэсу. Цыкл вершаў А. Куляшова «З новай кнігі», аб якім ужо гаварылася, вельмі яскравае таму пацвярджэнне. Ды ці толькі? А раманы І. Мележа «Людзі на балоце», І. Навуменкі «Сасна пры дарозе», Ул. Караткевіча «Нельга забыць», І. Пташнікава «Чакай у далёкіх Грынях», аповесці і апавяданні В. Быкава, Б. Сачанкі? У гэтых творах адчуваецца перш-наперш пераемнасць лепшых традыцый не толькі беларускай, а і братніх літаратур. Гэтыя творы даюць падставу гаварыць пра плённае імкненне пісьменнікаў ставіць новыя жыццёва важныя праблемы і вырашаць іх або скарыстоўваючы творча традыцыйныя класічныя формы, або (у меншай ступені) ствараючы новыя. Нарэшце, гэтыя творы практычна сцвярджаюць запісанае ў праграме КПСС палажэнне аб тым, што «ў мастацтве сацыялістычнага рэалізму, заснаваным на прынцыпах народнасці і партыйнасці, смелае наватарства ў мастацкім паказе жыцця спалучаецца з выкарыстаннем і развіццём усіх прагрэсіўных традыцый сусветнай культуры».

Дарэмна Ул. Жыжэнка (артыкул «Талент — гэта яшчэ не ўсё!») сумняваецца, **наўрад ці можна назваць да канца (?) наватарскім** па стылю раман І. Мележа «Людзі на балоце». Што значыць па стылю? Хіба стыль не ўменне «шчыльна зліваць ідэю з формай» (В. Бялінскі), што, дарэчы, і сцвярджае Ул. Жыжэнка ўсім ходам сваіх разважанняў пра раман. Няма ніякай падставы раман «Людзі на балоце» лічыць не наватарскім толькі таму, што ён выканан у строгай класічнай манеры беларускай прозы.

Наватарскі характар раману надае шчырая трывога пісьменніка за тое, каб вярнуць чалавеку чалавечнае ў новым жыцці, якое нарадзіла сацыялістычная рэвалюцыя ў «забытым богам краі», як называлі некалі беларускае Палессе. Пытанне старшыні валвыканкома Апейкі: «Але што мы за такая Савецкая ўлада, калі нас свае баяцца павінны?» — звернута не толькі да канкрэтнага носьбіта рэвалюцыйнага правапарадку начальніка міліцыі Харчава. Яно як бы звернута да тых нядаўніх часоў у жыцці савецкага народа, калі прымус браў часта верх над пераканаyнем. Даследаванне вытокаў гэтага пытання і надае раману наватарскі характар.

І. Мележу давялося ўжо выслухаць шмат папрокаў за «несучаснасць» яго твора. Такія папрокі, мне здаецца, ідуць ад схематычнага разумення самога працэсу рэвалюцыйнага пераўтварэння нашага грамадства. Мы бясконца паўтараем, што чалавек будучыні нараджаецца сёння. Але ж рэвалюцыя, якая перамагла ў 1917 годзе, жыве, змагаецца, творыць новае і сёння. Дык чаму ж мы не хочам бачыць таго, што рысы чалавека будучыні пачалі фарміравацца ў недалёкім мінулым. Паказаць вось гэты працэс і задумаў аўтар рамана «Людзі на балоце».

У рамане не адчуваецца супярэчнасці паміж наватарствам зместу і традыцыйнасцю формы мусіць таму, што пісьменнік з высокай патрабавальнасцю мастака паставіўся да слова як да сродку выражэння характа самога жыцця. Іменна гэта ўменне надаць слову сілу, якая здольна параніць чалавека душэўна ці падбадзёрыць яго, забіць або ацаліць, і дазволіла І. Мележу дасягнуць таго высокага напалу грамадзянскіх пачуццяў, якім поўніцца першая кніга задуманай ім трылогіі.

Не цяжка адзначыць і ў рамане І. Навуменкі «Сасна пры дарозе» гарачага жадання аўтара глянуць праўдзе ў вочы і паглыбіцца ў роздум над прычынамі разгубленасці і расчараванасці тых, хто не паспеў у першыя дні вайны адразу ўключыцца ў актыўную барацьбу з ворагам. Няхай раман грашыць некаторай расцягнутасцю, няхай не ўсе героі ў ім поўна раскрылі магчымасці свайго характару, адпаведна адведзенай ім сацыяльнай ролі, але адно бясспрэчна — пісьменнік здолеў у кожным з іх выявіць сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці, здолеў раскрыць псіхалогію паводзін народа на вайне. І ў гэтым нельга не бачыць наватарскага падыходу да жыццёвага матэрыялу.

Сцвярджэнне давер'я да чалавека, як асобы, а ў сувязі з гэтым выкрыццё ўсяго, што замінае гэтаму сцвярджэнню — вось, бадай, асноўная тэндэнцыя беларускай літаратуры сёння. І не толькі беларускай, а ўсёй савецкай літаратуры. Абвешчаны ў Праграме партыі маральны кодэкс камунізма ў поўнай ступені вызначыў гэтую тэндэнцыю. Узнікла надзённая патрэба павысіць увагу да пытанняў маральнага аблічча чалавека, узмацнеў унутраны пратэст пісьменніка супраць усялякіх захадаў збедніць, спрасціць яго. Пісьменнікаў займаюць цяпер праблемы складанага ўзаемадзеяння ідэйных, маральных, гістарычных і эмацыянальных граней характару і паводзін чалавека. Іменна ў такім узаемадзеянні паказаў А. Салжаніцын свайго героя ў аповесці «Адзін дзень Івана Дзянісавіча».

Узаемадзеянне свядомасці герояў з эмацыянальна-псіхалагічным выяўленнем характару дало магчымасць Д. Граніну ў рамане «Іду на навальніцу» стварыць мноства вельмі складаных унутраных калізій і праз іх паказаць тыя супярэчнасці, якія рухаюць развіццё характару. І яшчэ, Д. Граніну ўдалося паставіць праблему ўзбагачэння духоўнага зместу чалавека, удасканалення яго інтэлекту.

Ураўнаважанасць станоўчага і адмоўнага, раўналежнасць развіцця канфліктуючых сіл супрацьпаказана сапраўднаму мастацтву, бо тады знікае магчымасць руху, дынамікі канфліктаў, зніжаецца палемічная завостранасць, меншым становіцца грамадзянскі пафас. А іменна грамадзянскай узрушанасці і нестае яшчэ шмат якім творам беларускай прозы.

Абвостранай увагай да гуманістычнага зместу жыцця чалавека адзначаны многія апавяданні Б. Сачанкі, раман І. Пташнікава «Чакай у далёкіх Грынях» і яго апошнія апавяданні («Алёшка», «Алені», «Сцяпан Жыхар са Сцешыц»). І. Пташнікаў ужо ў сваёй першай аповесці «Іллюк Чачык» выявіў грамадзянскую зацікаўленасць да пасляваеннай неўладкаванасці жыцця калгаснай вёскі. Паказаць жывое жыццё вёскі нашых дзён паставіў сабе за мэту пісьменнік і ў рамане, але скажам адразу, — не здолеў сваю ўнутраную грамадзянскую ўсхваляванасць, сваё абурэнне, свой гнеў супраць запусцення і цемры, што трываюць у адсталым калгасе, трансфармаваць у такія ж якасці тых герояў, якія па задуме аўтара ўступаюць у канфлікт, у змаганне. Але не мелі падстаў тыя з крытыкаў рамана, хто папракаў І. Пташнікава ў карыстанні аднымі толькі чорнымі фарбамі, у нейкім шаманстве з прыродай. Негрунтоўнасць гэтых папрокаў становіцца відавочнай, калі ўзняцца над эмпірычным бокам крытыкі, адысці ад сацыялагічнай схемы і звярнуцца да індывідуальнай своеасаблівасці мастака. А яна — у лірычным характары таленту; у схільнасці да такога паказу прыроды, калі яна пачынае выступаць не толькі як сродак выяўлення пачуццяў герояў, але і як самастойная дзеючая сіла ў агульным канфлікце; у рэльефнай маляўнічасці фразы, у яе эмацыянальнай напоўненасці, у вялікай экспрэсіі слова. І калі раман І. Мележа «Людзі на балоце» ўспрымаецца як палатно, выкананае сродкамі жывапісу, дык раман «Чакай у далёкіх Грынях» хутчэй як добра выкананая гравюра.

І. Пташнікаў, Б. Сачанка і іх аднагодкі сёння ў няспынных пошуках, хоць ведаюць, што прызнаць новае — значыць **закрэсліць многае** ў сваёй творчай біяграфіі. Шукаць цяжка. Яшчэ цяжэй **не страціць знойдзенае**, асабліва для маладых. Ім трэба быць вельмі пільнымі да крытыкі (калі не абыходзіцца без традыцыйнай аглоблі), каб захаваць адкрытае. Мне здаецца, што ў гэтых пісьменнікаў ужо мінае пара непасрэднай уражлівасці і ўсё з большай сілай заяўляе аб сабе ўзмужнеласць іх незвычайнага таленту. Адбор жыццёвага матэрыялу становіцца больш строгі, больш асэнсаваны.

У апошні час маштабнасць адлюстравання чамусьці крытыкі вітаюць больш, чым рэльефнасць. І ці не таму такой нечаканасцю бываюць творы, напісаныя густа, выпукла, «осязаемо». Не варта кананізаваць ні адно, ні другое. Усё дыктуецца задумай, індывідуальнай манерай пісьменніка. Праўда, калі б уласцівая І. Пташнікаву рэльефнасць пісьма спалучалася ў рамане з маштабным адчуваннем жыцця па-за Грынямі, твор ад гэтага толькі б выйграў. Але дзіўна слухаць, калі ад Б. Сачанкі, які пісаў галоўным чынам кароткія апавяданні, мініяцюры, патрабуюць маштабнасці паказу закранутай ім сферы жыцця. Тут можа ісці гаворка толькі пра маштабнасць думак і пачуццяў у творы, пра паўнату паказу характараў, пра глыбіню іх псіхалагічнага раскрыцця. Там, дзе Б. Сачанка аддаляецца ад аб'екта адлюстравання і спрабуе паглядзець на яго праз прызму грамадскага, жыццёвага вопыту, пісьменніка сустракае ўдача.

Каб папрокаў «маладой» літаратуры ў недастатковым паказе чалавека і грамадскай сферы яго быцця было менш, варта не забывацца на словы В. Вароўскага: «Мастак узнаўляе ў сваім творы кавалак жыцця, сапраўднага ці таго, якое ўяўляе, і яго асабістае «я», што з'яўляецца канвой творчасці, афарбоўвае ўвесь твор у той суб'ектыўны колер, які і паказвае «тэндэнцыю» аўтара». Між тым, як мастак паказвае свой час, і тым, як ён яго адчувае і вытлумачвае, павінна існаваць дакладная ўзгодненасць. Тады толькі твор будзе сапраўды сучасны.

Сёння каб быць сапраўдным мастаком, мала валодаць дарам слова, важна не ўступіць у кампраміс са сваім сумленнем чалавека і грамадзяніна. Сучаснасць літаратуры — гэта перш за ўсё **грамадзянскасць, партыйнасць**, мужнасць пісьменніка гаварыць вялікую праўду, імкненне змагацца за яе, жаданне прымусіць трапятацца сэрца і ўзрушыць свядомасць чытача. Мужнымі могуць быць толькі моцныя духам людзі, а дух гартуецца жыццёвым вопытам народа, яго інтэлектуальнымі скарбамі.

«Сапраўднае жыццё — жыццё розуму і сэрца» (М. Чарнышэўскі). Партыя і заклікае пісьменнікаў адлюстроўваць іменна сапраўднае жыццё ў яго рэвалюцыйным развіцці, перспектывы якога асветлены высокімі гуманістычнымі ідэаламі народа, што будуе камуністычнае грамадства.

ФУЧЫК—ЖУРНАЛІСТ-ПАДПОЛЬШЧЫК

Заўтра выдатнаму сыну чэшскага народа, таленавітаму пісьменніку і бліскучаму публіцысту Юліусу Фучыку споўнілася б 60 год. У памяці кожнага з нас ён жыве маладым — мёртвыя, як сказала Анна Зэгерс, застаюцца маладымі. Ён жыў і памёр так, як належыць жыць і паміраць камуністам — у барацьбе за свабоду і шчасце свайго народа і людзей усяго свету, і яго смерць была пачаткам бессмяротнасці.

Член Камуністычнай партыі Чэхаславакіі з дня яе заснавання, Юліус Фучык прысвяціў вялікай ідэі камунізма ўсё сваё светлае жыццё і ўвесь яркі талент пісьменніка і журналіста. Ён называў Савецкі Саюз «краінай, дзе наша заўтра ўжо стала ўчарашнім днём», і сваёй працай на радзіме набліжаў світанак заўтрашняга дня. Ён горача любіў Край Саветаў, і ў нас ведалі і любілі Юліуса Фучыка. Ён быў ганаровым членам рэдакцыі нашага «Полымя» і супрацоўнічаў у прагрэсіўным беларускім выданні ў Празе «Прамень». Па-сапраўднаму братнімі былі сустрэчы Фучыка з пісьменнікамі і дзеячамі беларускай культуры. Цішка Гартны, успамінаючы сваю паездку ў Прагу ў 1927 годзе і спатканні з Ю. Фучыкам, Б. Матэзіусам, П. Горай, К. Томанам і іншымі сябрамі Савецкага Саюза, пісаў: «Усе хутка пераазналіся паміж сабою і ўсе ўмоўнасці самі сабой адпалі. Уперамежку з гутаркамі на культурна-сацыяльныя тэмы падняліся пытанні аб літаратуры, тэатры і песні. Тав Ю. Фучык заверыў нас у тым, што падбярэ адпаведныя творы для перакладу на беларускую мову і напіша крытычны нарыс аб сучаснай чэхаславацкай літаратуры». Не Фучыка віна ў тым, што абмен культурнымі каштоўнасцямі паміж нашымі краінамі ў тыя часы сустракаў перашкоды з боку буржуазных улад Чэхаславакіі.

У першы месяц Айчыннай вайны Ю. Фучык у падпольным выданні «Рудэ права» з захапленнем пісаў аб мужнасці беларускага народа, які праяўляў цуды гераізму, адстойваючы сваю свабоду. А мы схіляем галовы перад гераізмам і мужнасцю Юліуса Фучыка, які і ў гітлераўскім засценку ні на хвіліну не спыняў вялікай не на жыццё, а на смерць — бітвы за свае ідэалы.

Ён пісаў, забыўшыся пра катаў: «Я любіў вас, людзі».

Яго «Рэпартаж з пятлёй на шыі» — гэта запавет усім жывым, маніфест гарачай любві камуніста да чалавецтва і нянавісці да яго ворагаў.

Густа Фучыкава напісала кнігу ўспамінаў аб апошніх гадах Ю. Фучыка, якая нядаўна выйшла ў Празе. Я пераклаў урывак з гэтай кнігі, які і прапануецца чытачам.

А. МАЖЭЙКА.

Густа ФУЧЫКАВА

22 чэрвеня 1941 года Гітлер вераломна напаў на Савецкі Саюз. Як толькі вестка аб гэтым дайшла да нас, у Чэхаславакію, усе прыкметна ажывіліся: кожны быў упэўнены ў перамозе Савецкага Саюза над Гітлерам, разыходзіліся толькі ў здагадках, калі гэта адбудзецца. Адны лічылі, што вайна не працягнецца і двух месяцаў, другія прадказвалі, што яе канец будзе ўзімку. Мы яшчэ не ўяўлялі сабе як след ваеннай моцы Гітлера, якую ён атрымаў пасля акупацыі амаль усёй Еўропы, дзе на яго працавалі ўсе ваенныя заводы.

У ліпені я спаткалася з Юлекам у Празе. Тады ён яшчэ не сказаў мне, што стаў члечам падпольнага ЦК партыі. Ён прачытаў мне напісаную разам з Іванам *) адозву з выпадку нападу Гітлера на Савецкі Саюз. Яна была надрукавана ў падпольнай «Рудэ права» за подпісам Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Чэхаславакіі. У адозве, у прыватнасці, гаварылася:

«Ніколі яшчэ чэшскі народ не адчуваў так глыбока і моцна непарыўнай дружбы, адвечнай прыхільнасці да народаў СССР, як цяпер. Кожнаму сумленнаму чалавеку зразумела, што найвялікшая ва ўсёй гісторыі бітва, якую вядзе на Усходзе Чырвоная Армія з ордамі фашысцкіх звяроў, з'яўляецца таксама бітвай за нашу будучыню, за наш лёс, за нашу свабоду. Наш народ ніколі не забудзе, што пасля Мюнхена, калі ўсе нам здрадзілі і пакінулі нас, адзін Савецкі Саюз узнімаў грамадскую думку свету на нашу абарону. Сёння за нашу свабоду паміраюць слаўныя сыны міралюбных братніх народаў Савецкага Саюза. Ім, нашым дарагім братам, нашым верным сябрам — наша павага, наша захапленне, наша любоў, з імі б'ецца сэрца ўсяго нашага народа...»

Глыбокай восенню 1941 года на нелегальнай кватэры ў Рыбаржавых Юлек урачыста заявіў мне, што ён з'яўляецца членам Цэнтральнага Камітэта партыі і яму даручана кіраўніцтва падпольным друкам...

Юлек стаў галоўным рэдактарам падпольнага камуністычнага друку. Гэта забірала ў яго надзвычай многа часу і сіл, але свае абавязкі ён выконваў самаддана, з вялікай стараннасцю і самаахвярнасцю. З асабліва шчырай любоўю адносіўся ён да цэнтральнага органа партыі. Цяпер, праглядаючы падпольныя лістоўкі і часопісы, якія тады выдаваў Юлек, я заўсёды адчуваю не толькі смутак, але і глыбокую пашану да іх і гордасць. У іх столькі сілы і пераконанасці ў нашай перамозе, столькі любві да людзей, да новага свету, свету сацыялізма, столькі вернасці і адданасці камуністычнай партыі — і не толькі Юлека, але і тых таварышаў, якія друкавалі падпольныя выданні, перапісвалі іх на машынцы, адбівалі на васкоўцы, якія размнажалі і патаемна распаўсюджвалі іх. Многія плацілі за гэта сваім жыццём. Праз колькі рук праходзіла кожная лістоўка — ад аднаго чытача да другога, як глыбока ўздзейнічаў яе змест, як дапамагалі яны выкоўваць вялікае адзінства нашага народа ў час акупацыі, як дапамагалі паглыбіць любоў і давер'е да Савецкага Саюза! Наколькі дарагія былі гэтыя падпольныя лістоўкі для нашага народа, сведчыць ужо тое, што ён захоўваў іх праз усю акупацыю.

Журналісцкая дзейнасць Юлека была ў тыя часы вельмі важнай часткай яго жыцця. Перш чым аддаць у друк гатовы нумар «Рудэ права», ён аддаваў яго на абмеркаванне астатнім членам Цэнтральнага Камітэта... Шмат часу было прысвечана рэдакцыйным нарадам аб падпольнай «Рудэ права»!

Для сваёй працы Юлеку неабходна было ведаць настрой людзей. Таму Высушыл, Бакса, яго жонка, Лідушка, я, муж і жонка Елінекі, Ганус, пазней Рыбаржавы і іншыя прыносілі яму весткі з фабрык, заводаў, устаноў, вакзалаў, магазінаў, трамвайнага парку. Юлек не мог абысціся без сувязі з людзьмі, ён павінен быў ведаць, чым яны жывуць. Мы былі яго вачамі і вушамі.

18 ліпеня 1941 года паміж Савецкім Саюзам і прадстаўнікамі Чэхаславацкага ўрада быў заключан дагавор аб узаемадапамозе ў барацьбе супраць нацысцкай Германіі. Паведамляючы пра гэта ў падпольнай «Рудэ права», Юлек пісаў:

«Падпісаннем дагавору з Чэхаславакіяй Савецкі Саюз прадэманстраваў, што ён не прызнаваў і ніколі не прызнае акупацыі Чэхаславакіі... Дагавор аб узаемадапамозе з Савецкім Саюзам азначае таксама, што Чэхаславакія як дзяржава знаходзіцца ў стане вайны з Гітлерам...»

Юлек паведаміў чытачам і пра тое, што на тэрыторыі Савецкага Саюза і з яго згоды будуць стварацца самастойныя часці чэхаславацкай арміі, якія разам з Чырвонай Арміяй будуць змагацца супраць Гітлера і разам даб'юцца перамогі над ім. Дагавор з Савецкім Саюзам мабілізуе не толькі чэхаславацкіх грамадзян за мяжой — усе мы змагаемся супраць Гітлера.

Матэрыялы для артыкулаў у «Рудэ права» Юлек браў галоўным чынам з радыёперадач Масквы, адкуль прыходзілі ўказанні ад сакратара КПЧ таварыша Готвальда і яго супрацоўнікаў Швермы, Копецкага і іншых. Імёны гэтых таварышаў ніколі не называліся ў перадачах, але Юлек ведаў, што гэта іменна яны працуюць у СССР, набліжаючы дзень нашага вызвалення. Па некалькі гадзін у дзень сядзеў ён каля радыёпрыёмніка, лавіў савецкія станцыі і прымаў іх перадачы на чэшскай, рускай, нямецкай і французскай мовах. Акупанты выдалі загад, па якому слуханне замежнага «варожага» радыё сурова каралася. Кожны ўласнік радыёпрыёмніка атрымаў папяровы ярлык з надпісам: «Памятай! Памятай, што слуханне замежнага радыё забаронена і цягне за сабой турэмнае зняволенне або кару смерцю» і павінен быў прымацаваць гэты ярлык да апарата так, каб заўсёды мець яго перад вачыма. Аднак вельмі нямногія ў Чэхіі выконвалі тады гэты загад.

З лета 1941 года падпольная «Рудэ права» выходзіла раз у месяц. Апрача гэтага, Юлек выпускаў і спецыяльныя выданні. Асабліва мы ганарыліся, калі «Рудэ права» ўдавалася набраць у друкарні. Такі нумар меў шэсць гусста надрукаваных старонак невялікага фармату і загаловак дакладна такі самы, як у даваенным легальным выданні. Вельмі часта «Рудэ права» друкавалася на рататарах, і тады загаловак маляваліся самі — часам прыгожа, часам і няўмела. Іншы раз яго проста выстукваліся на пішучай машынцы вялікімі літарамі.

Бывала, што Юлек хацеў апублікаваць радыёперадачу з Савецкага Саюза слова ў слова. І хоць у яго была выдатная памяць і, слухаючы радыё, ён рабіў нататкі, але ўсё ж гэтага было недастаткова, каб потым узнавіць паведамленне поўнасцю.

Неяк ён даведаўся з радыёперадачы, што 10 і 11 жніўня 1941 года ў Маскве адбудзецца ўрачыстае мітынг прадстаўнікоў усіх славянскіх народаў, першы ў гісторыі славянскі сход такога роду. Вядома, што пра такую важную і значную для нашага народа падзею Юлек абавязкова хацеў напісаць у «Рудэ права». Таксама ён вельмі хацеў апублікаваць прамову таварыша Здэнека Няедлы, якая павінна была перадавацца Маскоўскім радыё.

Пані Высушылава прынесла мне допіс, у якім Юлек прасіў мяне застэнаграфаваць прамову Здэнека Няедлы і наогул па магчымасці ўсё, што будзе перадавацца пра славянскі мітынг.

Таварышы дасталі мне партатыўную пішучую машынку. Юлек праверыў, колькі закладак можна змясціць у такую на першы погляд нетрывалую маленькую машынку. І, упэўніўшыся, што да дзесяці, быў вельмі задаволены.

Усеславянскі мітынг у Маскве быў такой падзеяй, што Юлек як журналіст лічыў неабходным прысвяціць яму поўнасцю спецыяльны выпуск «Рудэ права», з чым згадзіліся і астатнія члены Цэнтральнага Камітэта. На першай старонцы ён змясціў верш Яна Няруды «Толькі наперадзі». І перадавы артыкул, у якім падкрэсліваў надзвычайнае значэнне Усеславянскага мітынгу ў Маскве. Славянскі сход, пісаў ён, кіруецца жыццёвымі інтарэсамі ўсіх славянскіх народаў, якія жадаюць жыць у міры, свабодзе і дружбе не толькі паміж сабой, але і з усімі астатнімі народамі, як роўныя з роўнымі.

Юлек вельмі радаваўся, што ўдалося апублікаваць поўнасцю палымяную прамову прафесара Няедлы.

У спецыяльным выпуску «Рудэ права» Юлек таксама апублікаваў адозву Усеславянскага мітынгу ў Маскве, якую падпісалі выдатныя славянскія пісьменнікі і вучоныя: Аляксей Талстой, Аляксандр Карнайчук, Янка Купала, Ванда Васілеўская, Здэнек Няедлы, Аляксей Стаянаў і іншыя.

У мяне захаваўся гэты спецыяльны выпуск у трох варыянтах: адзін — набраны ў друкарні, другі — адбіты на васкоўцы, трэці — на рататары і змяшчае толькі верш Няруды і Юлекаў перадавы артыкул.

Падпольную «Рудэ права» і яе спецыяльныя выпускі Юлек пісаў сам, я толькі стэнаграфавала маскоўскія прамовы.

...Так адзін за другім падрыхтоўваў Юлек нелегальныя нумары «Рудэ права».

*) У «Рэпартажы з пятлёй на шыі» Ю. Фучык пісаў пра яго: «Перш за ўсё я ўстанавіў сувязь з Гонзай Выскачылам, які кіраваў работай у Сярэдняй Чэхіі. Ён быў чалавек з ініцыятывай...».

Юліус і Густа Фучыкавы.

ГОСЦІ БЕЛАРУСКІХ КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ

Работнікі Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў прымаюць гасцей — творчую групу Аргкамітэта Саюза работнікаў кінематаграфіі СССР. У складзе дэлегацыі старшыня секцыі дакументальнага кіно народны артыст РСФСР, лаўрэат Дзяржаўных прэмій І. Капалін, галоўны рэдактар творчага аб'яднання перыядычных выданняў Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў Я. Козыраў, адзін з вядучых аператараў-кінадакументалістаў, лаўрэат Дзяржаўных прэмій П. Касаткін.

Старшыня дэлегацыі Ілья Пятровіч Капалін у гутарцы з нашым карэспандэнтам сказаў:

— 25 студый выпускаюць зараз у нашай краіне навукова-папулярныя і хранікальна-дакументальныя фільмы. 25 студый не 25 школ, гле індывідуальныя асаблівасці ёсць у кожнага калектыву. Вось чаму так неабходны творчыя сустрэчы паміж работнікамі кіно, узаемны абмен думкамі. Беларускіх кінадакументалістаў мы прымалі ў Маскве год назад. Абмеркаванне работ студыі ў Цэнтральным Доме кіно выклікала ажыўлены абмен думкамі. Цяпер на месцы мы збіраемся працягнуць гэтую размову, працягнуць на новым матэрыяле, з больш шырокім складам удзельнікаў.

Аргкамітэт надае вялікае значэнне паездкам творчых работнікаў для аказання дапамогі на месцах. Але размова з беларускімі таварышамі паслужыць і ўзаемнаму ўзбагачэнню вопытам, яна будзе карыснай не толькі мінчанам, але і нам.

З сабой мы прывезлі два фільмы, выпушчаныя Цэнтральнай студыяй. Абмеркаванне, такім чынам, будзе двухбаковым. Мы спадзяёмся, што шчырая размова не абмяжуецца толькі выпушчанымі работамі, яна закране шырокае кола пытанняў дакументальнага кінамастацтва.

АКТЫЎНЫЯ ПРАПАГАНДЫСТЫ МУЗЫКІ

Творчыя калектывы Савецкіх Узброеных Сіл уносяць свой немалы ўклад у справу развіцця савецкага мастацтва. Сёння яны поўны жадання працаваць яшчэ лепш, аказваць яшчэ больш дзейсную дапамогу ў камуністычным выхаванні асабовага складу Савецкай Арміі.

Вялікую ролю ў прапагандзе музычнага мастацтва сярод воінаў адыгрываюць шматлікія ваенныя духавыя аркестры. Зрэшты, яны прапагандуюць лепшыя ўзоры савецкай і класічнай музыкі, далучаюць да музычнага мастацтва не толькі воінаў, але і самыя шырокія масы працоўных і вучнёўскай моладзі. Сувязь ваенных духавых аркестраў з народам, з шырокімі гледачамі і слухачамі — стала традыцыяй. Савецкі народ любіць ваенныя аркестры. Шматлікія іх канцэрты на плошчах у дні ўсенародных свят, у парках, на канцэртных пляцоўках і сцэнах клубаў, палацаў культуры, канцэртных залаў, той пастаянны поспех, які спадарожнічае гэтым канцэртам, сведчыць пра іх вялікую папулярнасць.

Адным з вядучых творчых калектываў, якія праводзяць канцэртную работу сярод воінаў і працоўных у Савецкай Беларусі, з'яўляецца духавы аркестр штаба Беларускай ваеннай акругі. Нам часта даводзіцца выступаць з канцэртамі на лепшых сцэнах тэатраў і канцэртных залаў, палацаў культуры і клубаў горада Мінска. Любоўна арганізоўваюць нашы канцэрты па тэлебачанню музычная рэдакцыя і рэдакцыя перадач для воінаў Мінскай тэлестудыі. Часта аркестр гучыць і па Беларускаму радыё. Вельмі добрай традыцыяй сталі рэгулярныя святы ваеннай музыкі і вялікія канцэрты духавых аркестраў на плошчах Мінска ва ўрачыстыя дні.

Прыгадваецца канцэрт, які адбыўся на Цэнтральнай плошчы ў дзень гістарычнага палёту Ю. Гагарына ў космас. Дзесяткі тысяч мінчан запоўнілі плошчу. Канцэрт цягнуўся больш гадзіны і кожны нумар, кожны твор слухачы сустракалі гарачымі апладысментамі. Прыгадваецца яшчэ адзін канцэрт, з якім выступіў наш калектыў у цэху Мінскага завода запасных частак у час абедзеннага перапынку. Залаю была пляцоўка цэха, а рабочыя завода размясціліся непасрэдна ля станкоў. Ніколі не забудуцца засяроджанасць і ўвага нашых слухачоў, іх цёплыя словы падзякі ваенным музыкантам.

Нашы творчыя сувязі з воінамі і працоўнымі рэспублікі з кожным днём усё больш мацнеюць. Толькі летась аркестр даў звыш 40 канцэртаў, выступіў перад рабочымі трактарнага, аўтамабільнага заводаў, Мінскага завода запчастак, па радыё, па Мінскім тэлебачанні, перад студэнцкай моладдзю і ў парках горада.

Мы пачалі практыкаваць новую форму канцэртаў з праграмай, складзенай па заяўках воінаў—выдатнікаў баявой падрыхтоўкі, ударнікаў камуністычнай працы заводаў, камсамольскага актыву.

Вялікую дапамогу ў нашай канцэртнай дзейнасці аказвае нам Беларуская дзяржаўная філармонія. Сістэматычна і з вялікай ахвотай выступаюць з аркестрам яе салісты — заслужаная артыстка БССР Е. Эфрон, Л. Шубіна, А. Купрыянава, Д. Зубрыч і іншыя.

З лекцыямі аб музычным мастацтве на гэтых канцэртах выступаюць І. Зубрыч, Л. Ауэрбах.

Аднак, гаворачы пра сувязь нашага аркестра з філармоніяй, хацелася б выказаць некаторыя прапановы. На жаль, канцэртная дзейнасць аркестра пакуль што абмежавана толькі Мінскам. Чаму б філармоніі не праявіць у гэтым сваёй ініцыятывы і не арганізаваць гастрольныя паездкі аркестра па Беларусі. Можна не сумнявацца, што камандаванне і Палітупраўленне Беларускай ваеннай акругі падтрымае гэтае карыснае пачынанне. Арганізацыя такіх выязных канцэртаў значна пашырыла б сферу дзейнасці аркестра, яшчэ больш наблізіла б нас да шматлікіх нашых слухачоў — аматараў духавой музыкі, дала б нам магчымасць прыняць яшчэ больш актыўны ўдзел у прапагандзе музычных ведаў.

Неабходна ў сувязі з гэтым закрануць пытанне і аб рэпертуары. Аб тым, што мы адчуваем рэпертуарны голад, што нам не хапае добрых маршаў, п'ес для духавога аркестра, не раз ужо гаварылася і раней. Нашы шматлікія слухачы чакаюць ад нас выканання твораў, у якіх былі б адлюстраваны гераічнае мінулае і сучаснае Савецкай Беларусі і яе цудоўнага народа.

Нашым праграмам нестае патрыятычных уверцюр, праграмных п'ес, якія ўслаўлялі б неўміручыя подзвігі герояў Вялікай Айчыннай вайны, беларускіх партызан, фантазій для духавога аркестра на тэмы беларускіх народных песень. Дзве фантазіі на тэмы беларускіх песень Б. Куніна і В. Зудзіна і некалькі маршаў — вось і ўсё, напісанае беларускімі кампазітарамі для духавога аркестра за апошнія гады. І на далейшае нідзе несуцяшальныя.

Перада мною тэматычны план Дзяржвыдавецтва БССР на 1963 год. У раздзеле «Музычная літаратура — інструментальныя творы» запланавана выданне ўсяго толькі аднаго (!) твора для духавога аркестра — Гімна БССР. Чаму гэта так? Ды таму, што выдаваць і няма чаго. А вось калі б Міністэрства культуры зрабіла заказы кампазітарам на творы для духавых аркестраў, калі б яно разам з Саюзам кампазітараў арганізоўвала конкурсы на лепшыя маршы, п'есы для духавога аркестра, калі б да выдання гэтых твораў было больш увагі, тады і актыўнасць беларускіх кампазітараў у гэтай галіне творчасці вырасла б.

Дастаткова прыгадаць конкурс, аб'яўлены Міністэрствам культуры БССР і ЦК ЛКСМБ на лепшы фестывальны марш для духавога аркестра ў 1958 г. Актыўны ўдзел у конкурсе прынялі тады кампазітары М. Чуркін, Я. Цікоцкі, П. Падкавыраў, Я. Глебаў і іншыя. І гэта прынесла свой плён.

Было б вельмі карысна таксама выдаваць лепшыя пераладжэнні духавога аркестра асобных твораў беларускіх кампазітараў, якія робяць нашы ваенныя музыканты і ваенныя дырыжоры.

Гаворачы пра рэпертуар, трэба сказаць і пра тое, што асабліва дрэнныя справы з так званым танцавальным рэпертуарам. Духавыя аркестры не маюць дастатковай колькасці твораў добрай танцавальнай музыкі; сёе-тое ў гэтых адносінах робіцца цэнтральнымі музычнымі выдавецтвамі, аднак многа яшчэ выдаецца танцаў старых, малавыразных, да таго ж інструментаваны яны часта прымітыўна. А мы, работнікі армейскіх творчых калектываў, глыбока перакананы ў тым, што неабходна адкрыць «зялёную вуліцу» духавым аркестрам не толькі на канцэртную эстраду, але і туды, дзе таксама фарміруюцца музычныя густы, — на танцавальныя вечары. Дапамагчы нам у гэтым павінны таксама беларускія кампазітары. Дарэмна яны грэбуюць нашым жанрам, бо яшчэ Стасаў гаварыў, што «духавыя аркестры — праваднікі музыкі ў масы народныя».

Мы, творчыя работнікі ваенна-аркестравай службы, будзем і надалей памнажаць свае намаганні па прапагандзе музыкі сярод самых шырокіх мас воінаў і працоўных Савецкай Беларусі.

А. МАЙЗЛЕР,
начальнік аркестра штаба ВВА, заслужаны артыст БССР.

САЛДАТЫ АРМІІ МІРУ

НЕ МАГЛІ мы абмінуць і аматарскую кінастудыю. Гэта, бадай, самы малады самадзейны калектыў Дома афіцэраў: працуе ён толькі другі год. Аднак кіраўнік кінааматараў Васіль Тарасавіч Шыракавумаў жартуе:

— Хоць і самы малады, але і самы баявы!

Што ж, можа, і так. Работы студыйцаў ужо бачыў і станоўча ацаніў глядач. Гэта, у першую чаргу, кінанарыс «Паход выходнага дня» — пра турыстаў Дома афіцэраў, і кіначасопіс «У славу Радзімы». Апошні на рэспубліканскім аглядзе аматарскіх кінафільмаў атрымаў прэмію.

У пакоі кінастудыі, дзе ўсё зроблена рукамі студыйцаў, мы засталі маёра Ул. Мажарава і лейтэнанта В. Лявіцкага. Яны манцiравалі другі нумар часопіса «У славу Радзімы», які раскажа пра лепшых воінаў Беларускай ваеннай акругі — выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Мы ад душы пажадалі «мантажнікам» поспехаў.

У тэатральную залу нас паклікала зайсці песня. Тут заканчвалася генеральная рэпетыцыя святочнага канцэрта. Сёння выступленне гэтага зводнага хору прагучыць на ўрачыстым вечары, прысвечаным слаўнай гадавіне Савецкай Арміі.

Даўно звечарэла. Канчаўся яшчэ адзін будні, звычайны дзень. У вокнах Дома афіцэраў гасла святло. Толькі з блакітнай залы плылі гукі салдацкага вальса: моладзь танцавала. Мы пакідалі гэты дом — дом весялосці, творчасці, прыгажосці. І неяк міжволі прыходзілі на памяць радкі з газет — паведамленні адтуль, з так званага «свабоднага свету», накшталт: «Амерыканскі сяржант збіў аўтамашынай чатырнаццацігадовую дзяўчынку. Выратаваць пацярпеўшую не ўдалося» (Заходняя Германія), «Тры п'яныя амерыканскія салдаты абрабавалі і забілі шафёра таксі» (Заходні Берлін), «Амерыканскі ваенны патруль застрэліў японскага селяніна» (Акінава). А з Паўднёвай Карэі можна было прачытаць і паведамленне аб тым, што паблізу Сеула будуецца спецыяльны «вясёлы» гарадок для паўночна-амерыканскіх акупантаў, дзе будзе ўсё — ад начных бараў са стрыптызам да публічных дамоў.

Якім пачварным дысанансам гучыць усё гэта побач з тым, што мы бачылі і чулі ў Доме афіцэраў! І неяк яшчэ ярчэй паўставаў у памяці прывабны вобраз сціплага і прыгожага Салдата нашай сацыялістычнай арміі.

Салдат Савецкай Арміі. Быць ім — ганаровы абавязак кожнага грамадзяніна нашай сацыялістычнай Радзімы. Быць ім — значыць, стаяць на варце заваёў сацыялізма, на варце Міру.

І яшчэ. У той вечар са сцэны гучала песня «Салдат міру». Спяваў яе маладзенькі салдат — пра сваіх дзядоў і бацькоў, пра сябе і сваіх сяброў. І таму, можа, гэты фотарасказ мы і назвалі вось так:

— Салдаты арміі міру!

М. ГІЛЕВІЧ.
Фота **Ул. Крука.**

Мілан КУНДЭРА.

АПОШНІ МАЙ

Прысвечаная Юліусу Фучыку паэма вядомага чэшскага паэта Мілана Кундэра «Апошні май», урывак з якой мы друкуем, уваходзіць у лік твораў, прадстаўленых у анталогіі «Чэшская паэзія XX стагоддзя».

...І сонца крывёю набракла,
Кроў стала і кветкай, і лістам.
Грыміць яго голас набатна:
«Не здраджваем мы, камуністы!
Памром, а не здрадзім народу,
Жывём для якога мы зроду...
Не! Слова вы не вырвеце з мяне!
Мяне пагроза смерці не сагне.
У вас ёсць зброя! А ці стане ў вас
Куль на ўсе песні, што пяюць пра нас!
У вас ёсць нож! Але не ў сілах вы
Зарэзаць ім наш вобраз агнявы,
Адлюстраваны у грудзях людскіх.
Як сонца ў хвалях велічных марскіх!
Страляйце ж! Ды наш дух нястрымны
Жыць будзе ў дрэвах і цяснінах.
Мы не дадзім спакою вам,
Мы асядлаем буру-смерч,
І мы павіснем груганамі
Над вамі,
Нібы смерць!
Хоць абматайце ўсю планету,
Увесь свет калючымі дратамі,
Але я знаю, дротам гэтым
Вы абматаецеся самі!..

Тады з Карпат сарвуцца ураганы,
І ў бой памчацца лес, хрыбты і дол,
І рынуцца у наступ партызаны,
Як гром,
Як песня,
Як арол!

Дык страляй, забойца!
Я — перад табой!
Друг падніме зброю, —
І не сціхне бой!
Хоць сто раз страляйце!
А на кулі вашы
Рэхам адзавецца
Гром з Усходу страшны,
Час расплаты йдзе!..
Цэльцеся у грудзі!
Хай жа маё сэрца
Голубам высока
У неба узнясецца
З раненых грудзей.
Кроў мая, лятун мой,
У лесе не сядзі ты!
Ў будучыню смела
Ты ляці скрозь бітвы!
Кайданоў няма там,
Сцен нямых і кратаў,
Там цябе пасадзяць
На руку дзяўчаты.
Там няма граніцаў,
Трубы баявыя,
Там даўно іграюць
Танцы агнявыя.

Там у ствалах старых гармат
Жыве сям'я драздоў.
Усе там дома, там няма
Сірот і жабракоў.
Там па сардэчнаму слаўцу
Сумуе зорак рай,
І зорка ўніз ляціць, каб жыць
У цеплыні зямной.

Там і цемра не сляпая,
Там скала і то спявае,
Явар там шуміць, гайдае
Кронаю густой.
Дык ляці, ляці з прыветам,
Мой вястун, на крыллях ветра
Ў край цудоўны той!»

Пераклаў з чэшскай мовы
К. ПАЎТАРЖЫЦКІ.

ПІСЬМЕННІКУ-ГЕРОЮ

Юліуса Фучыка — выдатнага пісьменніка-рэвалюцыянера, нацыянальнага героя чэхаславацкага народа — добра ведаюць у Беларусі. Яго творы карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў савецкіх чытачоў. Заўтра спаўняецца 60 год з дня нараджэння Ю. Фучыка. Гэтай даце прысвечана выстаўка, адкрытая ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Ул. І. Леніна. На выстаўцы экспануюцца яго кнігі «Рэпартаж з пятлёй на шыі», «Артыкулы аб літаратуры», «Аб Сярэдняй Азіі» і іншыя творы, выдадзеныя на чэшскай і рускай мовах. Тут ёсць таксама нумары часопісаў «Новый мир», «Звезда Востока», «Нева», «Полымя», дзе друкаваліся творы Ю. Фучыка, матэрыялы аб яго жыцці і творчай дзейнасці. Сярод шматлікай літаратуры пра пісьменніка — успаміны Г. Фучыкавай, кнігі А. Каніметава «Ю. Фучык у Савецкім Кіргізстане», І. Радволінай «Расказы пра Ю. Фучыка», драма Ю. Бураковскага «Прага застаецца маёй» («Ю. Фучык»), раздзелы з рамана Я. Рэзніка «Світанне над Влтавай», «Балада пра вока» А. Кулышова і іншыя творы, прысвечаныя чэхаславацкаму герою. Чытачы бібліятэкі з цікавасцю знаёмяцца таксама з матэрыяламі выстаўкі.

М. НАВІЦКІ.

ЗБОРНІК ДАКУМЕНТАЎ ПА МАСТАЦТВУ

Многія дакументы і матэрыялы па гісторыі беларускага савецкага мастацтва захоўваюцца ў архівах Масквы, Ленінграда, Мінска, Віцебска і іншых гарадоў краіны. Яны мала вядомыя масаваму чытачу. Калектыў навуковых супрацоўнікаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР разам з супрацоўнікамі архіваў рыхтуе двухтомнае выданне гэтых дакументаў. Асобна выдзелены раздзелы па тэатру, музыцы, кіно, тэатральна-музычнай самадзейнасці. Сярод дакументаў і матэрыялаў — пастановы ЦК КПСС і Савецкага ўрада па пытаннях мастацтва, дырэктыўныя пісьмы, адносіны, дакладныя запіскі, перапіска творчых арганізацый, заметкі і інфармацыі перыядычнага друку аб адкрыцці і рабоце тэатральных і музычных устаноў, аб гастрольных паездках артыстаў і музыкантаў, рэзалюцыі канферэнцый і з'ездаў. У зборніку выкарыстан таксама артыкул Зм. Бядулі «Кузня беларускага мастацтва», які друкаваўся ў газеце «Савецкая Беларусь» 9 верасня 1923 года. Першы том зборніка, работа над якім нядаўна завершана, ахоплівае дакументы і матэрыялы 1917—1941 гг., другі — 1941—1960 гг.

ТЭАТРАЛЬНЫ МІНСК

Выйшаў чарговы нумар бюлетэня «Тэатральны Мінск». Ён адкрываецца артыкулам А. Бутакова і М. Герасімовіча пра К. С. Станіслаўскага. У бюлетэні змешчаны кароткія рэцэнзіі А. Ладыгінай, Ю. Ужанцава, Ю. Гаўрука, Т. Вушко на спектаклі «Джаконда», «Кето і Катэ», «Зыбучыя пяскі», «Перад вянэрай», нататкі аб творчасці заслужанага артыста РСФСР І. Сарокіна. Чытачы з цікавасцю пазнаёмяцца таксама з праграмамі спектакляў сталічных тэатраў.

М. УСЦІНАЎ.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Б. ЛАДЫГІНА, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. М. МАКАЛЬ, І. А. САНКОВА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-24-61, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856 Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 05197